

«СТО ДВАРОЎ» ГРОДЗЕНШЧЫНЫ 5



МЕТАДЫ ДЫЯГНОСТЫКІ. ЯК ВЫБРАЦЬ ПРАВІЛЬНЫ 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 САКАВІКА 2022 г. СЕРАДА № 42 (29664)

## ЛІЧБА ДНЯ

**1,4 млрд рублёў**

*склаў прафіцыт рэспубліканскага бюджэту Беларусі ў студзені, паведаміла Міністэрства фінансаў. Даходы рэспубліканскага бюджэту склалі Br3,2 млрд, або 11,4 працэнта ўдакладненага гадавога плана. Паступленне ПДВ склала Br2,5 млрд, або 15,5 працэнта, падатку на прыбытак — Br5,2 млн (0,1 працэнта). Акцызы паступілі ў суме Br0,4 млрд (11 працэнтаў). Даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці склалі Br0,4 млрд (8,6 працэнта). Расходы рэспубліканскага бюджэту склалі Br1,8 млрд, або 5,8 працэнта ўдакладненага гадавога плана. На агульнадзяржаўную дзейнасць накіравана Br0,5 млрд (3,9 працэнта), фінансаванне нацыянальнай эканомікі — Br0,6 млрд (9,1 працэнта), фінансаванне сацыяльнай сферы (сацыяльная палітыка, адукацыя, ахова здароўя, фізічная культура, спорт, культура і сродкі масавай інфармацыі) — Br1,5 млрд (6,5 працэнта). Па стане на 1 лютага 2022 года запазычанасць па падатках і зборах склала Br278,6 млн.*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Беларусы, як ніхто іншы, гатовы размаўляць калі заўгодна і з кім заўгодна»

## Прэзідэнт Беларусі правёў вялікую нараду з Саветам бяспекі і Саветам Міністраў



Фота БелТА.

**Тэма ваеннага канфлікту ва Украіне стала тэмай чарговай нарады ў Аляксандра Лукашэнкі. На сустрэчу запрасілі больш за 50 чалавек: да членаў урада і Савета бяспекі далучылася экспертная супольнасць Беларусі. Такі шырокі склад удзельнікаў і новы фармат, па словах Аляксандра Лукашэнкі, абумовілі апошнія падзеі ў свеце, а галоўнае, іх спекулятыўная інтэрпрэтацыя ў СМІ і інтэрнэт-прасторы (асабліва ад апазіцыйных сіл) з домысламі і нахабнай хлуснёй.**

Прэзідэнт на пачатку размовы адзначыў, што плануе дакладна раскласці падзеі ва Украіне і іх перадумовы. «Спачатку вернемся да вытокаў гэтага сур'ёзнага еўрапейскага канфлікту. Дай бог, каб не перарос у планетарны. Ён пачаўся нават не ў 2014 годзе. Тады ён упершыню ўвайшоў у вострую ўзброеную фазу. Але што гэтаму папярэднічала...» — сказаў Прэзідэнт і фактычна правёў дэталёвы аналіз сітуацыі.

### ПРА ПАЛІТЫЧНЫЯ І ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ КАНФЛІКТУ

Па словах кіраўніка краіны, прычыны эскалацыі ваенна-палітычнай сітуацыі ў нашым рэгіёне — абсалютнае ігнараванне Захадам сістэмы бяспекі, нівеліраванне сістэмы стрымлівання і процівагі, дасягнутых пасля распаду Савецкага Саюза, абясцэньванне міжнародных дагавораў і пагадненняў, узмоцненая мілітарызацыя, асабліва Польшчы, Украіны і Літвы, павелічэнне ваенных бюджэтаў ЗША, Украіны. На ўнутрыпалітычным узроўні сярод перадумоў канфлікту Прэзідэнт вызначыў прапаганду нацысцкіх ідэй ва Украіне на фоне знішчэння рускай культуры, мовы, гістарычнай памяці.

«***Трагічны вынік усяго гэтага мы бачым сёння ва Украіне. Ці хацела гэтага большасць украінскага насельніцтва? Не. Але майдан зрабіў сваю справу***. Пры падтрымцы знешніх сіл быў учынены дзяржпераварот. Гэта прызналі нават на Захадзе. Пралілася кроў. У Данбасе пачалася вайна. Здрыганулася ўся Еўропа», — сказаў Аляксандр Лукашэнка і нагадаў пра ролю Беларусі ў міратворчых працэсах на працягу апошніх гадоў.

Ён успомніў прапановы выкарыстаць беларускіх вайскоўцаў у якасці міратворчага кантынгенту для таго, каб развесці канфліктуючыя бакі ў Данбасе, шэраг буйных ініцыятыў, накіраваных на перазапуск міжнароднага дыялогу па пытаннях еўрапейскай бяспекі («Хельсінкі-2»), заявы аб працягу выканання палажэнняў Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці. Не выйшлі беларусы і з Дагавора аб адкрытым небе, Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе.

«***Расійскае кіраўніцтва таксама звярталася да ЗША і НАТА з прапановамі аб пачатку адкрытага дыялогу па пытаннях бяспекі. Яго прапановы прама або ўскосна праігнаравалі. Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін неаднаразова адкрыта заклікаў паважаць расійскія інтарэсы ў сферы бяспекі. Гэтыя заклікі засталіся не пачутымі***, — расказаў кіраўнік краіны. — Украіну тым часам напампоўвалі зброяй і заахвочвалі да рэваншу ў Данбасе. Расцвілі экстрэмісцкія арганізацыі нацысцкага толку, а ў 2020-м пачалося разварушванне Беларусі.

СТАР. 2



Фота БелТА.

## КОРАТКА

- **Пачаўся прыём заявак на рэспубліканскі конкурс юных журналістаў «Старт».**
- Забарона на лоўлю шчупака дзейнічае ў большасці рэгіёнаў Беларусі да 15 красавіка.
- **У стаматалагічнай паліклініцы ВДМУ будуць вырабляць пратэзы з дапамогай сучаснага 3D-абсталявання.**
- Спектакль «Мікітаў лапаць» прадставіць Тэатр-студыя кінаакцёра 4 і 5 сакавіка.

Рэгіёны

# Прыпынкі, разметка, таксісты...

## ДАІ Гомельшчыны асвойвае новыя падыходы да арганізацыі дарожнага руху ў рэгіёне



**Плануецца, што, у прыватнасці, у абласны цэнтры значныя змяненні закрануць адну з галоўных артэрый горада — вуліцу Савецкую. Транспартны паток на гэтым напрамку злучае гістарычны цэнтр і «паўночныя вароты» Гомеля. Трафік тут заўсёды інтэнсіўны, а па колькасці рэзанансных ДТЗ з трагічнымі наступствамі вуліца , на жаль, у ліку гарадскіх антырэкардсменаў. Усё гэта не можа не выклікаць заклапочанасць у супрацоўнікаў дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі.**

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

22042

# «Беларусы, як ніхто іншы, гатовы размаўляць калі заўгодна і з кім заўгодна»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спробу дзяржперавароту ў нас зрабілі па ўкраінскім сцэнарыі з актыўным падключэннем украінскіх нацыяналістаў і цэнтраў кібервайны, размешчаных ва Украіне».

Прэзідэнт Беларусі мяркуе: перад тым як разабрацца з Расіяй, неабходна было разбурыць так званы беларускі балкон. А калі ў жніўні 2020 года бліцкрыг у Беларусі праваліўся, пачалі душыць эканамічна.

«***І тая Украіна, якую любіць кожны беларус, аказалася ледзь не ў фарватары антыбеларускай рыторыкі***. Было абвешчана аб «кардынальнай змене сітуацыі ў беларуска-ўкраінскіх адносінах» са спыненнем міждзяржаўнага дыялогу на вышэйшым і высокім узроўнях, спынена вяшчанне беларускіх інфармацыйных тэлеканалаў. Афіцыйны Кіеў падтрымаў калектыўны Захад у антыбеларускай рыторыцы і далучыўся да санкцый ЕС у адносінах да Беларусі. Неба Украіны закрылася для нашай авіяцыі», — канстатаваў факты Прэзідэнт.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, украінскім бокам была ўведзена забарона на імпарт беларускай электраэнергіі, абмежаваны пастаўкі асобных нашых тавараў, існуюць кропкавыя санкцыі для некаторых айчынных суб'ектаў гаспадарання, якія працуюць у сферы нафтаперапрацоўкі, пастаўкі калійных угнаенняў. Узмацніліся правакацыі на дзяржаўнай граніцы: з лістапада да студзеня ўкраінскімі сродкамі тройчы парушана паветраная прастора нашай краіны.

«А што адбывалася ў нашых заходніх суседзяў? У разы павялічыліся мерапрыемствы аператыўнай і баявой падрыхтоўкі з адпрацоўкай задач зусім не абарончага характару, як нас спрабавалі запэўніць, а менавіта наступальных дзеянняў. Паветраная разведка ўздоўж нашых граніц вялася з інтэнсіўнасцю 15—20 палётаў у тыдзень. Відавочна, у мэтах выяўлення сістэмы супрацьпаветранай абароны і ацэнкі нашых магчымасцяў», — дадаў Прэзідэнт.

Пад выглядам вырашэння праблемы міграцыйнага крызісу ў сумежных краінах была створана групоўка войскаў нібыта для прыкрыцця граніц ад незаконнага перасячэння мігрантамі, яе колькасць перавышала 30 тысяч чалавек, паведаміў даныя Аляксандр Лукашэнка. Украіна ж падцягнула да нашай граніцы больш за шэсць тысяч чалавек. Прэзідэнт сцвярджае, што ва Украіне таксама ў той час пачаліся нападзенні на беларусаў з крадзяжамі і збіццём.

## РЭАКЦЫЯ САЮЗНЫХ СІЛ

«У сукупнасці ўсе гэтыя факты відавочна паказвалі на магчымую падрыхтоўку Захаду да агрэсіі супраць Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. У існуючай сітуацыі кіраўнікі дзяржаў Беларусі і Расіі прынялі рашэнне па праверцы сіл рэагавання Саюзнай дзяржавы, — акцэнтаваў кіраўнік краіны. — ***Праверка была заклікана пацвердзіць трываласць адносін дзвюх краін, рашучасць у адстойванні сваіх нацыянальных інтарэсаў. Дарэчы, пасля завяршэння вучэння расійскія войскі ўжо рыхтаваліся да выбыцця ў месцы пастаяннай дыслакацыі***».

Па словах Прэзідэнта, «напампоўка» Украіны зброяй зашкальвала, штодня прыбывалі амерыканскія самалёты з грузам супрацьтанкавых і зенітных ракет, ВСУ значна павялічылі колькасць udараў па грамадзянскіх аб'ектах у Данбасе.

«У існуючым становішчы я папрасіў Пуціна пакінуць частку сіл для прыкрыцця Гомельскага напрамку. Сярэдзіна нашай граніцы з Украінай — непраходныя гушчары і багна. Брэсцкі напрамак ёсць чым прыкрыць. ***На Гомельскім напрамку ў сувязі з тым, што мы ніколі не збіраліся ваяваць з Украінай, ніколі не дыслацыравалі ўзброеныя сілы***», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што ў гэты час Украінай да граніцы былі падцягнуты ракетныя ўзбраенні. З-за ўзмацнення ваеннай актыўнасці Узброеных сіл Украіны і аднаўлення баявых дзеянняў па лініі судакранання бакоў кіраўнікі ДНР і ЛНР папрасілі ваеннай дапамогі ў Расійскай Федэрацыі.

«***Расіі не пакінулі выбару. Я ў гэты час разумеў, што з намі можа быць, але мы не ўцягваліся ў канфлікт. Нікога не правакавалі***. Для мяне важна было прыкрыць паўднёвую дзяржаўную граніцу. І, вы ведаеце, Прэзідэнтам Пуціным прынятае рашэнне аб правядзенні спецыяльнай ваеннай аперацыі ў Данбасе. Натуральна, меркавалася выкарыстанне групоўкі войскаў, якая засталася на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. І мяне ён аб гэтым інфармаваў у пяць гадзін раніцы 24 лютага», — сказаў кіраўнік краіны.

Як ён дадаў, вечарам 23 лютага перад прыняццем такога рашэння наша разведка знайшла на тэрыторыі Украіны ў непасрэднай блізкасці ад беларускай граніцы некалькі зенітных і ракетных дывізіёнаў, якія рыхтаваліся нанесці ўдар па расійскіх войсках у раёнах засяроджвання на нашай тэрыторыі і ў тым ліку па нашых аб'ектах.

«***Адначасова з абвяшчэннем рашэння на правядзенне аперацыі Расіяй быў нанесены папераджальны ўдар па гэтых пазіцыях, каб прадухіліць свае страты і ўздзеянне на Беларусь. Калі б гэта не зрабілі, тыя ракеты прыляцелі б у Гомель і Мазыр***», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Сёння спецаперацыя ва Украіне праводзіцца расіянамі на пяці напрамках: з Крыма, Данецка, Луганска ў напрамку Кіева, Чарнігава, Харкава, расказвае кіраўнік краіны.

«***Пры гэтым беларуская армія ніякага ўдзелу ў баявых дзеяннях не прымала і не прымае. Мы можам даказаць гэта каму заўгодна***. Але ўчора і амерыканцы прызналі, што не бачаць, каб нашы ўзброеныя сілы прымалі ці рыхтаваліся да ўдзелу ў гэтай аперацыі. Гэта ў адказ на заявы нашых збеглых мярзотнікаў, якія разгарнулі кампанію па ўсёй Беларусі, што заўтра пэўныя часці будуць уведзены на тэрыторыю Украіны. Ніякіх рашэнняў мной не прымалася. І без майго рашэння часці не могуць быць выведзены нават з казармаў», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, расійскае кіраўніцтва ніколі і не ставіла гэтае пытанне перад беларускімі ўладамі: у іх хапае і сваёй зброі, і людскіх рэсурсаў, і вайсковага майстэрства.

«***Мы і надалей не збіраемся ўдзельнічаць у гэтай спецаперацыі на Украіне. Няма такой неабходнасці. Мы прыкрываем дзяржаўную граніцу ад Брэста да Мазыра для прадухілення пранікнення ў краіну радыкалаў і зброі***. Я ўчора кіраўніку Генеральнага штаба генералу Гулевічу паставіў задачу — не прасі Бога, калі да нас пранікне хоць адна дыверсійная група з боку Украіны», — сказаў кіраўнік краіны.

Паводле яго, сёння разгорнуты дзесяць батальённа-тактычных груп для ўзмацнення паўднёвай граніцы, прывялі ў гатоўнасць сродкі СПА, каб не дапусціць удараў у спіну расійскім войскам.

«Міністр абароны далажыў мне аб гатоўнасці да прыкрыцця і заходняй граніцы яшчэ пяццю батальёнамі. Па-іншаму не можам. ***Мы ўвесь час чакаем правакацый ад заходніх партнёраў то ў палітыцы, то ў эканоміцы, то ў ваеннай сферы***. Цяперашняя сітуацыя, як гэта ні сумна, стала прамым вынікам безразважнай палітыкі Захаду, накіраванай на працісканне сваіх інтарэсаў у шкоду бяспецы іншых», — звярнуў увагу кіраўнік краіны.

## ПІЛЬНАСЦЬ НА ЎСІХ НАПРАМКАХ

Прэзідэнт паведаміў, што даў каманду ўзмацніць ахову дзяржграніцы на паўднёвым напрамку. «Мы дапамагаем і прыкрываем свае граніцы ў гэтым напрамку, але ўжо не асабовым складам Расійскай Федэрацыі, а верталётамі і некалькімі самалётамі ў Баранавічах, Гомелі і Лунінцы. І яны будуць тут знаходзіцца, пакуль я не скажу Прэзідэнту Расіі, што яны мне не трэба, пакуль не выстаўлю яшчэ пяць батальённых тактычных груп, каб прыкрыць гэты напрамак», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Таму не трэба гарлапаніць і крычаць, што мы з Віцебска або аднекуль будзем уварвацца ва Украіну. Гэта не наша задача», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што апошнім часам было зафіксавана, як Польшча і Літва сцягваюць да граніцы дадатковае ўзбраенне і асабовы склад. Таму ўзнікла неабходнасць прыкрыць заходні кірунак. «Помніце, калі я казаў, што мы не дазволім рускім страляць у спіну. Я меў на ўвазе вось гэта», — растлумачыў ён.



Фота БелТА.

ПРЭЗІДЭНТ заявіў: калі беларусы хочуць захаваць сваю краіну ў гэты востры перыяд, кожны павінен займацца сваёй справай.

«Нічога большага ад вас не трэба. Я займаюся сваёй справай. Вы гэта бачыце кожны дзень. Ураду і Нацыянальнаму банку даручана: адным — эканоміка, другім — фінансы», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што ўрад і Нацбанк павінны разам прымаць эканамічныя рашэнні. «Сёння не да таго, што мы незалежны ўрад, Нацбанк незалежны, а Прэзідэнт няхай прымае рашэнні. Збірайцеся і прымайце ўсе эканамічныя рашэнні — выверанrealыя, разумныя, на перспектыву. Калі бачыце абвастрэнне сітуацыі ў эканоміцы, фінансах, прымайце рашэнне. Золатавалютных рэзерваў у нас дастаткова. Калі нехта ашалеў і бегае за курсам рубля — гэта іх права, мы ж выбралі такую эканоміку», — дадае ён.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што народ на рэферэндуме падтрымаў папраўкі ў Канстытуцыю, якія, сярод іншага, прадугледжваюць і пераразмеркаванне паўнамоцтваў. «Нават тыя, хто не хацеў мяняць сітуацыю ў краіне, нас падтрымалі. Людзі адчуваюць, што адбываецца, лепш, чым мы з вамі. Гэта нам сігнал. Гэта перш за ўсё мне сігнал: дзейнічай. Прапанаваў — мы цябе падтрымалі. Дзейнічай. Таму я перакананча ўсіх вас прашу: надзвычайшчыны ніякай. Абвастрэння — ніякага. Сейце, убірайце, калі прыйдзе час, жаніцеся, выходзьце замуж, нараджайце дзяцей, ешце, выпівайце, але ў меру, каб галаву не страціць, — жывіце звычайным жыццём. Калі трэба будзе, я вас паклічу. Мы пакуль з ваеннымі кантралюем сітуацыю. Гэта наша святая справа», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

З беларускага боку непасрэдна па лініі граніцы ёсць пагранічныя пасты і манеўраныя групы. Пры неабходнасці можна задзейнічаць сілы міліцыі і асобных вайскоўцаў, але гэтага недастаткова, лічыць Прэзідэнт. «Мной прынята рашэнне закрыць гэту граніцу. І ні ў якім разе не дапусціць уварвання з боку натаўскіх войскаў на тэрыторыю Беларусі. І нават правядзення з іх боку на нашай тэрыторыі найменшых аперацый», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць таму, каб не дапусціць дыверсій, і ў сувязі з гэтым Прэзідэнтам дадзены даручэнні кіраўнікам прыгранічных абласцей. Ён прывёў прыклад: «Каранік (губернатар Гродзенскай вобласці Уладзімір Каранік. — «**Зв.**») будзе там рэферэндумам займацца, уварвуцца некалькі груп, тэрарыстычныя акты ажыццявяць для таго, каб насельніцтва ўскалыхнуць, і што потым? Таму апранай ваенную форму і займайся разам з памочнікам — ваенным (Юрыем Караевым, памочнікам Прэзідэнта па Гродзенскай вобласці, які мае вялікі вопыт работы ў сілавым блоку. — «**Зв.**»). І разам з Шулейкам там таксама яшчэ адзін ваенны (размова пра губернатара Брэсцкай вобласці Юрыя Шулейку і памочніка Прэзідэнта па гэтаму рэгіёну Валерыя Вакульчыка. — «**Зв.**»). Не расслабляйцеся».

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу, што ёсць неабходнасць у дадатковай ваеннай тэхніцы. У Беларусі размешчаны такія сродкі супрацьпаветранай абароны, як, напрыклад, зенітныя ракетныя сістэмы С-300ПС, комплексы «Тор-М2» і «Панцыр-С». У тым ліку, сіламі і сродкамі СПА краіны забяспечваецца абарона Беларускай АЭС. Аднак з улікам наяўнай абстаноўкі заходнія рубяжы неабходна ўзмацніць: «Нам аказалася недастаткова ваеннай тэхнікі. Асабістага складу нам будзе дастаткова. Тэхнікі — не. Я звярнуўся да Пуціна, каб нам акрамя С-400, які знаходзіцца ў Гомельскай вобласці, былі пастаўлены С-400», які будзе знаходзіцца крыху на захад ад Мінска для таго, каб не толькі Мінск прыкрыць».

Ён яшчэ раз падкрэсліў, што на гэты момант ні адна часць Узброеных Сіл Беларусі не выводзілася з месц пастаяннай дыслакацыі. «Яны гатовы. Усе гатовы. І калі патрэбна мабілізацыя, мы выверылі ўсе спісы — на працягу двух-трох сутак мы адмабілізуем па поўным ваенным часе ўсе падраздзяленні, якія трэба будзе мабілізаваць», — сказаў беларускі лідар.

Яшчэ раз на карце прысутным Аляксандр Лукашэнка растлумачыў тактыку абароны граніц на паўднёвым напрамку.

«Вось глядзіце, Мазырскі і Гомельскі напрамак. Тут заставаліся часці Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі. Я іх папрасіў застацца на паўднёвым усходзе. Мы батальёнамі і тактычнымі групамі гэту частку граніцы на паўднёвым захадзе прыкрылі пяццю батальёнамі. У нас ёсць дэсантна-штурмавыя брыгады Брэсцкая і Пінская. Мы гэтыя часці ўкамплектавалі наймацнейшым чынам, тут закрыліся. А тут (на поўдні. — «**Зв.**») у нас было адкрыта — і засталіся расійскія Узброеныя Сілы», — тлумачыў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, украінскія вайскоўцы рыхтавалі ракетныя ўдары па тэрыторыі Беларусі, а расійскія разведчыкі і пэўныя ўкраінскія інфарматары пацвярджалі гэту інфармацыю.

«Літаральна за шэсць гадзін да пуску ракет расіяне нанеслі ўдар па гэтых пазіцыях. У момант уступлення расіян ва Украіну мы гэтыя пазіцыі ўжо не бачылі. Таму я кажу, што былі пускі з тэрыторыі Беларусі, і расказаў, па якіх кропках мы наносілі ўдар», — паведаміў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адмаўляе фэйкі аб тысячах загінулых расіян на Украіне. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што сёння на тэрыторыі Беларусі размяшчаюцца параненыя расійскія салдаты: «Не трэба крычаць там пра тысячы загінулых. Мы гэтага не бачым. Сёння за ўвесь перыяд мы прапячылі каля 160—170 параненых. Ніякай масавай гібелі Узброеных Сіл Расіі няма».

Кожную раніцу пра лячэнне салдат Прэзідэнту дакладвае міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч. «Мы лячылі і будзем лячыць гэтых хлопцаў — у Гомелі, Мазыры. Заўсёды ў любой вайне ратавалі параненых», — акцэнтуе Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадвае, што расіяне наносяць удары кропкава, каб не пацярпела простае насельніцтва.

«Самая небяспека ў тым, што расіяне зараз дзейнічаюць хірургічна. Калі батальён вядзе бой і камбат бачыць, што гінуць яго хлопцы, ён будзе на «хірургію» глядзець?! Ён з усіх відаў зброі знясе тое месца, адкуль ідзе агонь. Таму я Зяленскаму сказаў: «Самае страшнае, калі расіяне цярпець-цярпець будуць, а пасля пярройдуць, як амерыканцы, да «каўровых бамбардзіровак», калі будзе знішчацца ўсё. Ты не паспееш нават з Украіны збегчы». Трэба аддаць належнае — расіяне пакуль праводзяць аперацыю «хірургічна», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў намаганні Беларусі для ўсталявання міру ва Украіне і дадаў: сёння робіцца ўсё, што ў нашых сілах, каб дапамагчы канфліктуючым бакам знайсці кропкі судакранання ў іх пазіцыях і спыніць кровапраліцце. «***І мы, беларусы, як ніхто іншы, гатовы размаўляць калі заўгодна і з кім заўгодна, ствараць тонкую нітку ўзаемнага даверу дзеля адной мэты — міру ў рэгіёне***», — запэўніў Прэзідэнт.

## «СУСТРЭЧА ЎНУШАЕ АСЦЯРОЖНЫ АПТЫМІЗМ»

Кіраўнік краіны падзяліўся, што было няпроста арганізаваць расійска-ўкраінскія перагаворы на беларускай зямлі. Вялікую ролю для ўстанаўлення кантактаў з Уладзімірам Зяленскім сыграў дэпутат Вярхоўнай Рады Украіны Яўген Шаўчэнка.

«Менавіта яго званок спрацаваў, і мы каля 40—45 хвілін з Валодзем Зяленскім абмяркоўвалі сітуацыю. Складаная была размова. Ён нас лічыў агрэсарам. Але мы дамовіліся. Я яму сказаў: «У Гомелі расійская дэлегацыя цябе чакае. Прыязджай. Вайна ідзе ў цябе. Канчай выступаць супраць, бо ўсіх сабак спусцяць на цябе», — пераказаў размову Аляксандр Лукашэнка.

Для дастаўкі дэлегацыі было неабходна прапусціць у Брэст натаўскія верталёты, на якіх ляцелі дэлегаты. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што сцішыў свой гонар — дазволіў палякам перасекчы дзяржаўную граніцу і прывезці ўкраінцаў у аэрапорт Брэста. З яго ўжо беларускія верталёты перавезлі дэлегатаў у Гомельскую вобласць.

«***Учарашняя сустрэча, па папярэдніх ацэнках дыпламатаў, унушае асцярожны аптымізм.*** Бакі дамовіліся працягнуць дыялог на беларуска-польскай граніцы. Ацэньваючы гэтыя перагаворы, я хачу сказаць: перагаворшчыкі малайцы. Зрабілі больш, чым было магчыма. Ніхто — ні Зяленскі, ні Пуцін, тым больш я, — ніколі не чакалі, што яны вызначаць тэмы, пытанні для перагавораў і знойдуць кропкі судакранання», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён дадаў: простымі словамі гэта значыць, што ёсць варыянты дамовіцца. Але іх належыць узгадніць з кіраўніцтвам Украіны і Расіі, чым і займаюцца перагаворшчыкі.

«***Гэта ўсяляе пэўную ўпэўненасць, што перагаворы могуць скончыцца спыненнем вайны. Але ўсё залежыць ад украінскага боку. Калі яны не будуць слухаць тое, што ім падкідваюць з Захаду і амерыканцы, вайна спыніцца***», — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што мы і далей, нягледзячы на складанасці і санкцыі, будзем трымацца міралюбівай лініі.

### ❍ КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ



**Віктар ГУЛЕВІЧ, начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі:**

«Магу са стапрацэнтнай гарантыяй сказаць, што нашых ваеннаслужачых на тэрыторыі Рэспублікі Украіна няма. Усе нашы ваеннаслужачыя выконваюць задачы толькі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. У любым выпадку мы адсочваем, аналізуем абстаноўку, якая складваецца. Улічваем словы сакратара НАТА Енса Столтэнберга, што будуць прыводзіцца ў павышаную ступень гатоўнасці сілы першачарговага задзейнічання. Гэта вялікая групоўка, якая можа знаходзіцца на граніцы з нашай краінай».

Па словах Віктара Гулевіча, складаная знешняя абстаноўка мабілізавала ўвесь асабовы склад Узброеных Сіл Беларусі, і нават дробныя парушэнні зменшыліся.

«Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь заўсёды ў гатоўнасці абараніць суверэнітэт нашай краіны. Зыходзячы з гэтага, мы не маем ніякіх агрэсіўных планаў у адносінах да сумежных краін. У першую чаргу нам важная ахова нашых граніц і тэрытарыяльнай цэласнасці», — рэзюмаваў Віктар Гулевіч.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «Захаваць гістарычную каштоўнасць святыні»

**Праводзячы рэканструкцыю Свята-Успенскага Жыровіцкага мужчынскага манастыра важна захаваць гістарычную каштоўнасць святыні. Аб гэтым перад нарадай па пытаннях рэканструкцыі манастыра паведаміла журналістам старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.**



«Пры наведванні Жыровіцкага манастыра Прэзідэнт Беларусі паставіў задачу: гэта месца павінна быць прыведзена ў парадак, яно павінна стаць сапраўднай жамчужынай Беларусі. Гэта месца — наша святыня. І мы на кантролі трымаем усе пытанні, якія датычацца гэтых работ», — расказала Наталля Качанава.

Як было адзначана, на цяперашнім этапе ідзе распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі па рамонце і рэканструкцыі некалькіх аб'ектаў. «На такой нарадзе мы ўжо абмяркоўвалі шэраг пытанняў, перш чым пачынаць работу. Цяпер у нас узнікла яшчэ некалькі пытанняў. Яны з'яўляюцца крыху спрэчнымі. Напрыклад, уцепленая падлога ў храме, свечачная крама, якую неабходна вынесці. За гэты час папрацавалі ўжо спецыялісты, якія вызначылі, ці магчыма гэта. Бо гэта гістарычная каштоўнасць — XVIII стагоддзе. І ёсць розныя меркаванні: ці то замяніць, ці то не кранаць. Для гэтага мы тут, каб прыняць правільнае рашэнне адносна ўнікальнага храма і ў цэлым Жыровіч», — дадала Наталля Качанава.



Фота БелТА.

На цяперашнім этапе праектна-каштарысная дакументацыя па рэканструкцыі шэрагу аб'ектаў праходзіць экспертызу. Як прагучала, крыніцы фінансавання — рэспубліканскі і бюджэт Гродзенскай вобласці. Будуць прыцягнуты таксама спонсарскія сродкі.

«Нядаўна я сустракалася з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Дзмітрыем Мезенцавым. Мы хочам, каб яны таксама ўключыліся ў працэс фінансавання. Важна выкарыстоўваць усе магчымасці, каб захаваць гістарычную каштоўнасць. Для гэтага патрэбны дадатковыя экспертызы, абследаванні. Асабліва актуальна такая работа ў Год гістарычнай памяці», — рэзюмавала Наталля Качанава.

Шок

# ЗА ГРАННЮ РАЗУМНАГА...

**Фэйк, што беларускія лётчыкі бамбяць украінскія гарады, — за гранню разумнага. У спісах Мінабароны Украіны — беларускія лётчыкі-героі Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч, якія загінулі ў 2009 годзе, заявіў карэспандэнту БелТА памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Беларусі генерал-маёр Леанід КАСІНСКІ.**

«Паведамленне на афіцыйным сайце галоўнага ўпраўлення разведкі Міністэрства абароны Украіны аб тым, што беларускія лётчыкі-героі Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч бамбяць украінскія гарады, ужо за гранню чагосьці разумнага», — сказаў Леанід Касінскі.

Паводле яго слоў, гэты фэйк развенчвае ўсе міфы аб удзеле Узброеных Сіл Беларусі ў спецыяльнай ваеннай аперацыі ў Данбасе «і з'яўляецца яркім прыкладам гібрыднай аперацыі заходніх спецслужбаў супраць Беларусі. А зараз — яшчэ і спробай сутыкнуць славянскія народы з мэтай вырашэння сваіх геапалітычных задач», — падкрэсліў памочнік міністра.

Як паведаміў Telegram-канал Міністэрства абароны Беларусі, на сайце галоўнага ўпраўлення разведкі Міністэрства абароны Украіны апублікаваны спіс беларускіх лётчыкаў, якія нібыта ажыццяўляюць бамбардзіроўку ўкраінскіх гарадоў. У спісах указаны лётчыкі-героі Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч, якія загінулі ў 2009 годзе ў польскім горадзе Радам падчас міжнароднага авіяшоу, калі пілатуемы імі самалёт Су-27 пасля выканання чарговай фігуры пілатажу на вачах у двухсоттысячнага натоўпу пачаў рэзка губляць вышыню і ўпаў на зямлю ў двух кіламетрах ад аэрапорта — усяго ў 100 метрах ад жылых дамоў. Лётчыкі адвялі самалёт ад населенага пункта, не катапультуючыся, і цаной свайго жыцця прадухілілі больш цяжкія наступствы.

Фінансы

# З ПАЧАТКУ САКАВІКА КЛІЕНТЫ БЕЛАРУСБАНКА МОГУЦЬ АДКРЫЦЬ БАЗАВЫЯ РАХУНКІ

## Варта адзначыць, што такая магчымасць даецца ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 363

**Разбяромся адразу, каму гэта трэба і што дае? Дык вось, для павышэння якасці і даступнасці банкаўскіх паслуг, узмацнення сацыяльнай абароненасці найбуйнейшы банк краіны стварае магчымасць адкрываць бягучыя (разліковыя) рахункі з базавымі ўмовамі абслугоўвання.**

Наогул, базавы рахунак — гэта бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак у беларускіх рублях, з уладальніка якога не спаганяецца ўзнагароджанне (плата) за ажыццяўленне на тэрыторыі нашай краіны і ў нацыянальным сегменце глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт аперацый, якія ўключаюцца ў базавыя ўмовы абслугоўвання.

Указ дае права фізічнай асобе на адкрыццё толькі аднаго базавага рахунку. Адметная асаблівасць гэтага базавага рахунку ад звычайнага бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку — магчымасць здзяйсняць рэгламентаваны пералік аперацый, па якіх банкам не спаганяецца ўзнагароджанне.

Базавы рахунак прызначаны для захоўвання і залічэння выплат сацыяльнага характару, стыпендый, надбавак да стыпендый і матэрыяльнай дапамогі навучэнцам, іншых грашовых сродкаў, якія паступаюць на карысць кліента наяўнымі грашыма або шляхам безнаяўнага пералічэння.

Мяне, напрыклад, больш за ўсё цікавяць тарыфы банка. А па базавых умовах абслугоўвання такога рахунку існуюць аперацыі, за якія плаціць наогул не трэба? Пералік гэты досыць аб'ёмны, але мы спынімся на асноўных.

Сюды падпадае адкрыццё базавага рахунку, у тым ліку ў выніку аперацыі пераносу такога рахунку; залічэнне на яго выплат сацыяльнага характару, заработнай платы і прыраўнаваных да яе выплат, стыпендый.

Таксама не трэба плаціць дадаткова за пералік з базавага рахунку грашовых сродкаў у выніку здзейсненых пры выкарыстанні карткі аперацый аплаты ў арганізацыях гандлю (сэрвісу), у тым ліку з дапамогай глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт; пералік з гэтага рахунку грашовых сродкаў у выніку здзейсненых пры выкарыстанні карткі аперацый аплаты з дапамогай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы.

Базавай умовай лічыцца і пералічэнне з такога рахунку грашовых сродкаў у выніку ажыццяўлення банкаўскага пераводу з дапамогай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы для іх залічэння на бягучы рахунак, рахунак па ўліку укладу (дэпазіту) фізічнай асобы альбо плацяжоў па крэдытным дагаворы, заключаным паміж банкам і кліентам.

Без узнагароды робіцца выпуск у абарачэнне адной банкаўскай карткі для выкарыстання кліентам, яе абслугоўванне, вяртанне (замена) у сувязі са сканчэннем тэрміну дзеяння або немагчымасцю выкарыстання такой карткі на працягу тэрміну яе дзеяння па прычыне, якая не залежыць ад спажыўца (фізічны знос карткі, яе тэхнічная няспраўнасць).

І яшчэ. Выдача з базавага рахунку наяўных грашовых сродкаў праз касы і іншыя аб'екты праграмна-тэхнічнай інфраструктуры банка ажыццяўляецца бясплатна толькі ў сувязі з закрыццём гэтага рахунку, а таксама ў іншых выпадках, устаноўлены Нацыянальным банкам нашай краіны.

Акрамя таго, да базавага рахунку можа быць афармлена картка белкарт-прэміум. Пры гэтым варта адзначыць, што наяўнасць базавага рахунку не абмяжоўвае права фізічнай асобы на адкрыццё ў банках іншых рахункаў і выкарыстанне розных плацежных інструментаў у адпаведнасці з банкаўскім заканадаўствам.

Для адкрыцця такога рахунку неабходна азнаёміцца з афертай па базавым рахунку і звярнуцца ва ўстанову банка з дакументам, які сведчыць асобу (для грамадзян, якія маюць права ў адпаведнасці з заканадаўствам на атрыманне пенсіі, дадаткова неабходна прад'явіць дакумент, які пацвярджае права на атрыманне пенсіі).

**Сяргей КУРКАЧ.**

Важна ведаць

# ЯК БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ПАЛІКЛІНІКІ ПАДЧАС ДОЎГІХ ВЫХАДНЫХ?

**Міністэрства аховы здароўя праінфармавала аб графіку работы паліклінік і бальніц у працяглыя выхадныя сакавіка.**

Такім чынам, амбулаторна-палікліцнічнае звяно, кансультацыйна-паліклінічныя аддзяленні РНПЦ і бальніц, арганізацыі пералівання крыві, санітарна-эпідэміялагічныя арганізацыі, аптэкі і арганізацыі медыцынскай тэхнікі будуць працаваць па наступным графіку:

5 сакавіка 2022 г. па графіку работы ў суботні дзень;

6 сакавіка 2022 г. па графіку выхаднога дня;

7 сакавіка 2022 г. па графіку работы ў суботні дзень;

8 сакавіка 2022 г. па графіку работы ў святочны дзень;

12 сакавіка 2022 г. па графіку рабочага дня.

**Работа бальніц і РНПЦ будзе арганізавана па наступным графіку:**

5 сакавіка 2022 г. па графіку работы ў суботні дзень;

6 сакавіка 2022 г. па графіку выхаднога дня;

7 сакавіка 2022 г. па графіку рабочага дня;

8 сакавіка 2021 г. па графіку работы ў святочны дзень;

12 сакавіка 2022 г. па графіку работы ў суботні дзень.

Пры фарміраванні графікаў работы медыцынскага персаналу будуць улічваца эпідэмічная сітуацыя, якая складваецца, і аб'ёмы неабходнай медыцынскай дапамогі. Нягледзячы на выхадныя дні, будзе забяспечана бесперапыннасць лячэбнага працэсу пры аказанні меддапамогі.

Традыцыйна служба хуткай медыцынскай дапамогі будзе працаваць у рэжыме павышанай гатоўнасці.

# З САКАВІКА ВЫРАСЛІ ПЕНСІІ

**З 1 сакавіка гэтага года ў Беларусі павышаюцца ўсе віды працоўных пенсій (па ўзросце, па выслузе гадоў, па інваліднасці, з нагоды страты карміцеля) на 7 працэнтаў. Указ Прэзідэнта № 24 «Аб павышэнні пенсій», нагадаем, быў падпісаны 31 студзеня 2022 года.**



Фота belmarket.by

Як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, у выніку павышэння сярэдні памер пенсіі па ўзросце непрацуючага пенсіянера, уключаючы надбаўкі і даплаты, у сакавіку складзе 580 рублёў і павялічыцца на 13,2 працэнта ў адносінах да сакавіка мінулага года.

Пенсіі па ўзросце з 1 сакавіка ў адносінах да лютага павялічацца ў сярэднім на 34 рублі, тэмп росту складзе 106,3 працэнта.

Аднак у міністэрстве звяртаюць увагу, што павелічэнне памеру пенсіі ў кожнага пенсіянера будзе сваё. Яно залежыць ад працягласці стажу і памераў заробку, улічаных пры налічэнні яму пенсіі.

На павышэнне пенсій будзе накіравана 75,7 мільёна рублёў на месяц, усяго 757 мільёнаў рублёў да канца года. У цэлым на выплату пенсій у 2022 годзе запланавана каля 16,1 мільярда рублёў.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні дырэктару рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі дзяржаўны геалагічны цэнтр» Марыне Яраслаўне Васілюк у сувязі са смерцю МАЦІ. Страчваючы сваіх блізкіх, мы страчваем частку сябе. Гэта душэўны боль, супраць якога няма лекаў. Няхай нашы словы спачування падтрымаюць вас у гэтыя цяжкія дні і дапамогуць перажыць гора страты. Шчыра смуткуем разам з вамі.**

Добрая навіна

# НОВЫЯ АБ'ЕКТЫ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ Ў СТАЛІЦЫ

**У Мінску ў 2022 годзе плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 17 аб'ектаў аховы здароўя, паведаміла старшыня Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Алена БОГДАН.**

Найбольш буйныя з іх — прыёмнае аддзяленне да неўралагічнага корпуса 5-й бальніцы, новыя будынкі 9-й дзіцячай паліклінікі, дзіцячай паліклінікі ў мікрараёне Сухарава, 15-й паліклінікі і г. д. На гэтым тыдні ўжо гатовы да ўводу мадэрнізаваныя будынкі паліклінікі № 16.

У 2022 годзе працягнецца работа па будаўніцтве і рэканструкцыі гарадскіх стацыянараў. Размова ідзе аб будаўніцтве хірургічнага корпуса бальніцы № 11, прыбудовы да ўралагічнага корпуса бальніцы № 4, блока трансплантацыі касцявога мозга і ствалавых клетак Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, трансплантологіі і гематалогіі.

Таксама ў 2022 годзе, расказала Алена Богдан, з улікам тэмпаў узвядзення жылля запланаваны пачатак будаўніцтва паліклінікі для дарослага насельніцтва ў пасёлку Усходні і дзіцячай паліклінікі ў жылым раёне Лошыца-9.

Працягнуцца праектныя работы па будаўніцтве дарослай і дзіцячай паліклінік у шматфункцыянальным комплексе Мінск-Мір, траўматалагічнага корпуса з прыёмна-дыягнастычным аддзяленнем і рэанімацыяй на тэрыторыі бальніцы № 6, будаўніцтве інфекцыйнага корпуса на базе дзіцячай інфекцыйнай бальніцы, рэканструкцыі будынка паліклінікі № 13.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Лаўроў заявіў, што прыйшоў час ядзернай зброі ЗША ў Еўропе «вярнуцца дадому»

**Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў заявіў, што наяўнасць амерыканскай ядзернай зброі на тэрыторыі Еўропы з'яўляецца непрымальнай, трэба вярнуць яе назад, паведамляе ТАСС.**

«Для нас непрымальна, што насуперак асновапалажэнням Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі на тэрыторыі шэрагу еўрапейскіх краін па-ранейшаму знаходзіцца ядзерная зброя Злучаных Штатаў», — падкрэсліў дыпламат. Паводле яго слоў, сёння няядзерныя краіны НАТА практыкуюць ядзерныя місіі, адпрацоўваюць сцэнарый прымянення ядзернай зброі па тэрыторыі Расіі. Лаўроў падкрэсліў, што звязаную з ядзернай зброяй інфраструктуру ў Еўропе неабходна цалкам знішчыць.

Міністр таксама заявіў, што кіеўскія ўлады, якія спрабуюць набыць уласную ядзерную зброю, пагражаюць міжнароднай бяспецы.

«Расія не можа не рэагаваць на рэальную небяспеку набыцця Украінай ядзернай зброі і прымае ўсе меры для недапушчэння гэтага», — падкрэсліў Лаўроў.

## Дзярждума збіраецца забараніць сурагатнае мацярынства

**Патрыяршая камісія пры РПЦ прадставіць заканадаўчыя ініцыятывы аб поўнай забароне інстытута сурагатнага мацярынства ў Расіі на сустрэчы з дэпутатамі 24 сакавіка, заявіла РІА «Новости» старшыня камітэта Дзярждумы па пытаннях сям'і, жанчын і дзяцей Ніна Астаніна.**

«24 сакавіка мы збіраем экспертаў свайго камітэта, якія нам павінны прапанаваць заканадаўчыя ініцыятывы па поўнай забароне сурагатнага мацярынства. Сумесна з намі над гэтым працуе Патрыяршая камісія пры РПЦ, рыхтуе нам канкрэтныя фармулёўкі ў заканадаўства», — сказала Астаніна.

Як растлумачыла парламентарый, у камітэце ўжо падрыхтавана папраўка ў Закон «Аб ахове здароўя», якая прапануе выключыць норму аб сурагатным мацярынстве.

«Я думаю, што ўсведамленне, што мы павінны адмовіцца ад продажу нашых дзяцей не толькі за мяжой, але і ўнутры краіны, яно прыйшло сёння калі не да ўсіх, то да многіх. Мы хочам унесці закон аб поўнай забароне сурагатнага мацярынства ў Расіі», — дадала яна.

## Астраномы заявілі, што выяўленае святло першых зорак аказалася памылкай назірання

**Сігнал, які раней інтэрпрэтавалі як першае святло ў сусвеце, магчыма, мае іншае паходжанне. Артыкул пра гэта апублікаваны ў Nature Astronomy.**



У 2018 годзе вучоныя выявілі ў космасе сігнал, які прынялі за святло першых зорак у сусвеце, што ўзніклі праз 180 млн гадоў пасля Вялікага выбуху. З-за чырвонага зрушэння ён дайшоў да людзей на радыёчастаце і істотна змяніў уяўленні астраномаў аб гісторыі сусвету: так, раней лічылася, што першыя зоркі сфарміраваліся толькі праз 200 млн гадоў пасля Вялікага выбуху. Акрамя таго, пры аналізе выпраменьвання атрымлівалася, што касмічны газ той эпохі быў вельмі халодным, чаго быць не магло. Вучоныя тлумачылі гэта ахалоджваннем аб цёмную матэрыю, якая для гэтага павінна была валодаць іншымі ўласцівасцямі, чым у сучасных разліках.

Даследчыкі спадзяюцца, што рана ці позна астраномам удасца ўлавіць сапраўднае святло першых зорак.

# Прыпынкі, разметка, таксісты...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аб прыярытэтных кірунках арганізацыі дарожнага руху ў абласным цэнтры і вобласці ў цэлым журналісты пацікавіліся ў **начальніка ўпраўлення ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Андрэя ГАРКУШЫ.** Па словах кіраўніка ведамства, сёння там чакаюць узгаднення новага плана арганізацыі дарожнага руху і паляпшэння дарожнай абстаноўкі. Згодна з ім, для Гомеля супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі разглядаюць пытанне ўладкавання прыпынкаў грамадскага транспарту ў асобных кішэнях на вуліцы Савецкай — на ўчастку ад плошчы Паўстання да плошчы Леніна. Ёсць прапанова аб'яднаць некаторыя прыпынкі, дзе прыпыначныя пункты размешчаны дастаткова блізка адзін да аднаго. Таксама абласной Дзяржаўтаінспекцыяй унесены прапановы па арганізацыі палос для павароту налева. Такая змена разглядаецца для арганізацыі праезду на перакрыжаванні вуліцы Савецкай з вуліцамі 50 гадоў БССР, Кожара і Галавацкага. Цяпер адпаведныя службы пралічваюць кошт, варыянты і магчымасці для правядзення гэтых работ.

Адна з апошніх ініцыятыў Дзяржаўтаінспекцыі Гомельшчыны — распрацоўка рэкамендацый па больш дакладным і строгім рэгламентаванні такога сегмента пасажырскіх перавозак як таксі. Значны рост колькасці ДТЗ з удзелам таксістаў — нагода для клопату, дадзеная праблема ўвогуле актуальная для ўсёй краіны. Адной з галоўных прычын такіх ДТЗ, упэўненыя ў ДАІ рэгіёна, надзвычай спрошчаны і часта некантралюемы працэс аказання паслугі ў сучасным фармаце: таксістам фактычна можа стаць кожны, хто мае пасведчанне кіроўцы.

Як адзначыў начальнік упраўлення ДАІ УУС аблвыканкама Андрэй Гаркуша, на Гомельшчыне адзначаецца рост колькасці аварый з удзелам аўтамабіляў таксі. Летась іх было зафіксавана 78 (на 18 больш, чым у 2020 годзе), загінулі два чалавекі і яшчэ 64 атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.

— На маю думку, работа транспарту таксі павінна быць больш арганізаванай. Павінны быць таксапаркі, якія будуць адсочваць вадзіцельскі састаў, стаж і тое, у якім стане кіроўцы прыходзяць на работу, дзе будзе праводзіцца перадрэйсавы кантроль. Пакуль гэты кірунак бескантрольны, — адзначыў Андрэй Гаркуша. — Праблема ёсць, пакуль яна не вырашана. Унесены пэўныя прапановы, працягваецца прапрацоўка гэтага пытання, — дадаў начальнік упраўлення.

Паводле яго слоў, не рэдкасць, калі інспектары ДПС спыняюць кіроўцаў таксі ў стане ап'янення. Часта выяўляюцца факты, калі за перавозку пасажыраў бяруцца таксісты, якія не маюць дастатковага досведу ваджэння.

Новы план арганізацыі дарожнага руху і паляпшэння абстаноўкі ў рэгіёне таксама разлічаны на працяг укаранення комплексу мер па прафілактыцы парушэнняў сярод усіх удзельнікаў руху, сумесную работу са СМІ па папулярызацыі захавання ПДР і недапушчэнні гібелі і траўматызму на дарогах. Значная ўвага будзе аддадзена і прымяненню новых фарматаў арганізацыі дарожнага руху.

Як звяртае ўвагу начальнік упраўлення ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама, па выніках мінулага года ў рэгіёне ёсць пэўнае зніжэнне колькасці ДТЗ. Так, летась зарэгістравана 445 дарожных аварый. Яны забралі жыцці 73 чалавек, 489 — пацярпелі.

— У гэтым годзе ў вобласці, на жаль, назіраецца рост ДТЗ з цяжкімі наступствамі, што выклікае асаблівую заклапочанасць супрацоўнікаў ДАІ, — звярнуў увагу Андрэй Гаркуша.



ДТЗ на вуліцы Савецкай у Гомелі. На шчасце, абышлося без ахвяр.

З пачатку года на тэрыторыі рэгіёна адбылося 67 ДТЗ, у якіх 20 чалавек загінулі і 66 — атрымалі траўмы.

Кіраўнік ведамства адзначыў фактары, якія ўплываюць на трагічную статыстыку. Сярод аўтамабілістаў, як звычайна, найбольшую небяспеку нясуць кіроўцы, якія селі за руль нецвярозымі. Пры гэтым некаторыя з іх не баяцца страціць пасведчанне, бо ўжо пазбавіліся яго раней.

— Летась па віне п'яных вадзіцеляў было ўчынена 51 уліковае ДТЗ, у якіх 17 чалавек загінулі, 66 — атрымалі раненні. Дробныя ДТЗ з удзелам нецвярозых кіроўцаў параненейшаму фіксуюцца амаль штодзень. Хоць варта адзначыць, што ў абсалютных лічбах такіх парушэнняў цяпер выяўляецца менш. На агульную карціну паўплывала ўзмацненне адказнасці, унесенае ў КаАП, — адзначыў начальнік упраўлення ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама.

Калі аналізаваць сумную статыстыку ДТЗ мінулага года, 33 аварыі зафіксавана з удзелам бяспраўнікаў. Гэтыя здарэнні абарвалі жыцці 10 чалавек, 39 чалавек былі траўміраваны.

— Па выяўленні на дарогах кіроўцаў у стане ап'янення, якія пазбаўлены правоў і былі неаднаразова прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, працуем комплексна, не толькі Дзяржаўтаінспекцыя, але і ўся міліцыя грамадскай бяспекі. Гэта прыносіць свой плён. Як вынік, летась адзначалі зніжэнне такіх ДТЗ, — звярнуў увагу Андрэй Гаркуша.

Сёння значныя намаганні супрацоўнікаў ведамства накіраваныя на прадухіленне ДТЗ з удзелам пешаходаў. Летась на тэрыторыі вобласці адбылося 141 такое здарэнне. Ахвярамі сталі 22 чалавекі і 124 — атрымалі траўмы. Як паказвае аналіз, канстатуе Андрэй Гаркуша, у большасці выпадкаў адзначаныя ДТЗ былі справакаваны грубымі парушэннямі правілаў дарожнага руху самімі ж пешаходамі. Гэта перасячэнне праезнай часткі ў неўстаноўленых месцах, знаходжанне на дарозе ў стане алкагольнага ап'янення, грэбаванне патрабаваннямі выкарыстання ў цёмны час сутак святлоадбівальных элементаў...

Нягледзячы на тое, што з кожным годам назіраецца пэўнае зніжэнне колькасці аварый з удзелам пешаходаў, праблема такіх здарэнняў вельмі непакоіць супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі Гомельшчыны, падкрэсліў начальнік упраўлення:

— Мы ў дэталях вывучаем усе ДТЗ з удзелам пешаходаў, накіроўваем прапановы, у тым ліку і ў органы ўлады, для ўнясення змяненняў у арганізацыю дарожнага руху, па асвятленні, укараненні іншых тэхнічных умоў на ўчастках вулічна-дарожнай сеткі. Асаблівая ўвага таксама аддаецца пастаяннай прафілактычнай рабоце з усімі ўдзельнікамі дарожнага руху. Гэта вялізная работа, але яна дае пазітыўныя вынікі, і мы будзем яе працягваць.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

На парадку дня

# У «ТОПЕ» — КАМФОРТНАЕ НАВАКОЛЛЕ

## Сёлета ў Гродне пачнецца маштабная работа па добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый

**Падлічана, што рамонту патрабуе каля паўтысячы гарадскіх двароў. Усе яны ўвайшлі ў праграму «Сто двароў», якая будзе дзейнічаць на працягу трох-трох з паловай года. Сёлета мяркуецца прывесці ў парадак 150 двароў з ліку найбольш праблемных. Першыя з іх ужо вызначаны. Большая частка прыпадае на паўночную частку гарадскога мікрараёна і прыбярэжны раён.**

Работы будуць весціся і ў цэнтры так званай старой гістарычнай часткі горада. Двары тут хоць і ўтульныя, але не заўсёды гарманіруюць з прыгожымі фасадамі вуліц. Таму іх таксама трэба прыводзіць у парадак. Адзін з іх, што знаходзіцца непадалёку ад плошчы Савецкай, якраз і трапіў у праграму па добраўпарадкаванні.



Аляксандра ўжо ўключылася ў работу па добраўпарадкаванні двара.

Мне пашанцавала. Стан згаданай дваровай тэрыторыі якраз аглядала майстар ЖЭСа № 5. З яе слоў, кантроль неабходны, бо раз-пораз узнікаюць праблемы з прыборкай. Такая сітуацыя звязаная з недахопам работнікаў.

Таксама яна расказала аб тым, якую работу варта правесці, каб двор выглядаў больш прывабна. На яе думку, трэба замяніць бардзюры, зараўнаваць ямы ў асфальце, папоўніць дзіцячую пляцоўку. А вось аўтамабільныя шыны, якія ствараюць нешта накшталт клумбы, будуць прыбірацца. Такую інсталяцыю некалі стварылі жыхары дома, але відавочна, што яна не мае ніякага эстэтычнага выгляду. «Шыны адназначна трэба адсюль забіраць і вывозіць, для гэтага будзе задзейнічаны спецыяльны транспарт», — адзначыла прадстаўнік ЖЭСа.

Пакуль на тэрыторыі жыллёва-эксплуатацыйнай службы будзе добраўпарадкавацца толькі адзін двор. Вядома, было б добра, калі б і іншыя двары былі ўключаны ў праграму, лічыць майстар. Двалькі тут невялікія, значных сродкаў наўрад ці патрабуюць.

А вось па вуліцы Камарова набярэцца больш за дзясятак двароў, якія ўключаны ў рамонт. У асноўным — каля інтэрнатаў, якія будаваліся для работнікаў некалі буйнога прадзільна-ніткачага камбіната. Пад добраўпарадкаванне трапілі і былыя кааператыўныя дамы. У некаторых зроблены капітальны рамонт — абноўлены фасады, пад'езды і балконы, але дваровая тэрыторыя вока не радуе.

Дарэчы, работы тут ужо вядуцца. Спачатку ідзе замена бардзюраў. Затым, па словах будаўнікоў, чарга асфальтавага пакрыцця.

Каля аднаго з дамоў заўважаю жанчыну, якая падграбае невялічкі палісаднік пад вокнамі. Аляксандра ўжо на пенсіі, але працягвае клапаціцца аб тым, каб вакол быў парадак. Цікаўлюся, ці задаволеная яна станам свайго двара. Аляксандра прыгадала, што некалькі гадоў таму адна з жыхарак была ініцыятарам арганізацыі дарогі каля дома. Праўда, на якіх умовах, жанчына не ведае, іншых работ па добраўпарадкаванні не помніць.

Пра тое, што іх дваровая тэрыторыя ўключана ў гарадскую праграму «Сто двароў», Аляксандра даведалася не так даўно. Заўважыла, што ў суседніх работы ідуць поўным ходам. Што канкрэтна зменіцца ў іх, пакуль не ведае. Ва ўсякім выпадку, спадзяецца, што двор стане больш утульным. Раён ёй падабаецца, дом стаіць у баку ад гарадской магістралі.

«Калі нам такое свята зробяць — невядома, хочацца, каб хутчэй», — выказваецца жанчына. І дадае, што сама гатовая паўдзельнічаць у некаторых работах, напрыклад, у азеляненні тэрыторыі. Усе дрэвы, кажа яна, пасаджаны тут самімі жыхарамі. Напрыклад, туя за паўстагоддзя вырасла ў вялікае дрэва. Ёсць месца і для маладых пасадак.

Больш падрабязна аб праграме «Сто двароў» расказаў **старшыня Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў Барыс ФЁДАРАЎ**:

— Гэта сапраўды праблема для горада, якая пакуль не вырашана. Некалькі разоў мы падступаліся да яе, але з-за недахопу сродкаў вырашыць у патрэбным аб'ёме не атрымлівалася. Сёлета гарвыканкамам прынята рашэнне накіраваць сродкі на рамонт дваровых тэрыторый. Пералік двароў і вуліц ужо вызначаны, ён будзе апублікаваны, кожны зможа ўбачыць, які двор трапляе ў базу. Прынцыпы два — па-першае, сюды трапілі самыя горшыя двары па стане, па-другое, калі ёсць ініцыятывы ад людзей, калі яны хочуць палепшыць свой двор і гатовыя садзейнічаць гэтаму альбо фінансава, альбо сваёй працай, — гарадскі бюджэт падтрымае такую ініцыятыву і сюды таксама будуць накіраваны сродкі.

Як аказалася, сродкі з'явіліся дзякуючы эфектыўнай рабоце эканомікі горада летась. Дынаміка назіралася практычна ва ўсіх галінах, выкананы ўсе прагнозныя паказчыкі. Рост даходаў грамадзян дазволіў у значнай ступені павялічыць падатковую частку бюджэту. Большая частка прыбытку, а гэта 15 мільёнаў рублёў, якраз і будзе накіравана на праграму «Сто двароў».

— Рамонтам дарог і вуліц мы займаемся заўсёды, летась у горадзе было адрамантавана даволі шмат вуліц. Значныя сродкі ішлі і на рамонт дамоў, у тым ліку на іх мадэрнізацыю. Такая работа вядзецца стабільна, а вось праблема двароў не вырашана. У выніку — разбітыя праезды, праходы, пешаходныя дарожкі. Цяпер усё гэта будзе прыводзіцца ў парадак, — паабяцаў Барыс Фёдараў.

Сёлета ў план уключана каля паўтары сотні двароў. Гэта нават больш, чым меркавалася ў пачатку фарміравання праграмы. Калі ўсё будзе ісці такімі тэмпамі, ёсць спадзяванні адрамантаваць запланаваныя 500 двароў за меншы тэрмін. Асабліва калі яшчэ і самі жыхары возьмуцца дапамагаць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ГЛХУ «Бобруйский лесхоз», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 99-к** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by.** |

**Предмет электронных торгов:**
**транспортное средство, бывшее в употреблении**
**Месторасположение: г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 99-к**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 01100070 | Автомобиль легковой специальный UAZ 3163, регистрационный транзитный знак 6ЕКТ7709, 2012 г. в., номер кузова (vin) XTT316300C0008793 316300C0510372 | 12 480,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390. **Срок внесения задатка по 01.04.2022 г.**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 04.04.2022 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **01.04.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу от 02.03.2022 г.**

**Контактные телефоны**: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
**(организатор аукциона)**
**по поручению КТПУП «Универмаг «Слуцк»**
**(продавец)**
**проводит открытый аукцион по продаже**

# ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ
## (наименование – нежилое помещение)

### общей площадью 70,9 кв. м, с инв. № 640/D-70035, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. Социалистическая, 142-61

Начальная цена без НДС **– 59 760,00** бел. руб.

*Начальная цена снижена на 10 %.*

Задаток 10 % от начальной цены **– 5 976,00** бел. руб.

**Сведения о земельном участке: кадастровый номер 642500000001000431, площадь 0,1595 га, общее долевое право постоянного пользования.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона реки Случь, пл.0,1595 га.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260 0169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

**Условия:**

1. В случае отсутствия необходимости изготовления проектной документации в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество проинформировать Слуцкий районный исполнительный комитет (далее – райисполком) об отсутствии необходимости получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ;

2. В случае необходимости проведения работы, требующей изготовления проектной документации:

- обратиться в райисполком для получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ не позднее одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество;
- начать разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ в течение 6 (шести) месяцев с даты получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ;
- согласовать с комитетом по архитектуре и строительству Минского областного исполнительного комитета предварительный проект на реконструкцию недвижимого имущества либо строительство нового с обязанностью его реализации.

3. Заключить договор купли-продажи недвижимого имущества на условиях, определенных райисполкомом.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 06.08.2021, 10.09.2021, 10.11.2021, 09.12.2021, 18.01.2022.

Аукцион состоится **21.03.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.03.2022** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (801795) 55-3-98; (8029) 348-93-25.**

УНП 600154568

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Автотрансстрой»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кап. строение с инв. № 630/С-49334 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование – складские помещения, для хранения и консервации автотранспортных средств и агрегатов, площадь – 985,7 кв. м) | 254 400,00 | 25 440,00 | 12 720,00 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые торги

**Местонахождение лота: Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2/4.**
Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 642000000003000030, площадью 4,4255 га, для обслуживания и эксплуатации производственной базы. Право аренды (87/100 доли)

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **1 апреля 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф.1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 02 марта 2022 года по 16.00 30 марта 2022 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA3012221 5570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах по Лоту 1, ОАО «Автотрансстрой», проводимых 01.04.2022.
2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **– Александр Викторович, тел. 80296468301.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Автотрансстрой» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375295767715; +375293489225 (Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, д. 2, УНП 600077182)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16** |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

**Лот № 1**

Производственная база в составе: **производ. корпуса** (1130,5 кв. м, 500/С-49698; 4340,5 кв. м, 500/С-53224), **диспетчерская** (54,7 кв. м, 500/С-53818), **здание специализир. иного назначения (литейный цех)** (7664,8 кв. м, 500/С-47329), **компрессорная** (473,6 кв. м, 500/С-54017), **электропечь термическая** (39,8 кв. м, 500/С-54018), **здание весовой** (24,3 кв. м, 500/С-54019), **административно-хоз. корпус** (2323,4 кв. м, 500/С-49697, составные части: проезды, площадки, подкран. путь, дорожки, подпор. стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница), **склад** (2328,4 кв. м, 500/С-53297), **склады** (895,5 кв. м, 500/С-53808), **склады, гаражи** (453,6 кв. м, 500/С-53897), **склады, администрат. помещения, агрегатные** (563,7 кв. м, 500/С-53846), **инженерный корпус** (3348,6 кв. м, 500/С-46093), **административно-производ. корпус № 4** (19710,5 кв. м, 500/С-53638), **склад** (2193,5 кв. м, 500/D-708019487), **строительный цех** (507,9 кв. м, 500/С-53845), **насосная станция автоматич. пожаротушения** (194,4 кв. м, 500/С-54016), **станция очистки сточных вод** (305,1 кв. м, 500/С-54015), **градирня** (39,1 кв. м, 500/С-55130), **ливневая канализац. сеть** (1077,5 м, 500/С-1029279), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (973,2 м, 500/С-1029266), **тепловая сеть** (236,7 м, 500/С-1029272). **Иное имущество, входящее в состав лота:** газопровод внутрицеховой (инв. № 12050078), внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), внутриплощадочные кабельные сети (инв. № 12020085), токопровод из алюминиевых шин 3-4 корп. (инв. № 12080111), площадка для складирования песка (гравий инв. № 11010193), склад баллонов с кислородом (инв. № 10020854), склад для хранения баллонов с аммиаком (инв. № 10020280), склад металлический (инструмент) (инв. № 10020810), склад макулатуры (инв. № 10020877), оборудование РП-2 (инв. № 13041173), конденсат. установки (инв. № 13041182, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), ТП (инв. № 13040099, 13040120), комплекты ТП (инв. № 13040082, 13040053, 13040030), комплект. распред устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты груз. (инв. № 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопас. (инв. № 28240071), объекты растительности: береза бородавчатая (инв. № 20054010), вишня 4 шт. (инв. № 20054002), груша (инв. № 20010005), яблоня (инв. № 20054008), липа мелколистная 3 шт. (инв. № 20054005), газоны 10 шт. (инв. № 20050404)

***Сведения о земельном участке****:* предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га)

**Обременения по лоту № 1:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания с инвентар. номерами 500/С-53224 (лот № 1), 500/С-46093 (лот № 1) находятся в залоге у банков. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
На территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота.
Покупатель одновременно с подписанием договора купли-продажи недвижимости заключает с Продавцом предварительный договор аренды на часть капитального строения инв. № 500/С-49698 (комната № 4 (подстанция) 33,6 кв. м, и комната № 5 (подстанция) 52,0 кв. м). Договор аренды Покупатель обязуется заключить с Продавцом в течение 2 рабочих дней с момента перехода права собственности на объект недвижимости. С предварительным договором о заключении договора аренды части капитального строения можно ознакомится на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 14 049 808,08 бел. руб.**
(снижена на 50 %)

**Лот № 2**

Производственная база в составе: **заводоуправление** (2763,5 кв. м, 500/С-53298, составные части: проезд, дорожка, площадки, ограждение, бордюры), **производ. корпус** (13365,7 кв. м, 500/С-45217), **технологич. котельная** (200,30 кв. м, 500/С-53824), **тепловая сеть** (43,8 м, 500/С-1029271), **ливневая канализац. сеть** (547,1 м, 500/С-1029280), **хозяйственно-бытовая канализац. сеть** (161,3 и 169 м, 500/С-1029273, 500/С-1029277), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (68,4 и 295,1 м, 500/С-1029269, 500/С-1029267). **Иное имущество, входящее в состав лота:** внутриплощад. каб. сети (инв. № 12020084), комплект. ТП (инв. № 13040065), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040194), конденсат. установки (инв. № 13040294, 13040283, 13040171), шкафной газорегуляторный пункт (инв. № 11010728), низковольт. конденсат. установка (инв. № 13040225), токопровод из алюмин. шин 1 корп. (инв. № 12080109), насосное оборудование АБК, инв. № 28620483), электротехн. обор. АБК, инв. № 13041331), комплект. трансф. подстанция, инв. № 13040076), контейнер универс. 1СС (инв. № 25021204Д), склад металлич. (веники) инв. № 10020802), низковольт. конденсат. уст-ка, инв. № 13040202), склад пропан-бутан, инв. № 10020144), телефон. канализ. и смотр. устр., инв. № 12030041), забор из сетки рабицы, инв. № 11010800), склад металлический (для электрокары) инв. № 10020825), внутриплощад. сети связи, инв. № 11010562 и № 12030035), АТС БЕТА М5 № 1749 ТАИС.465235.012-02 (инв. № 25020008), объекты растительности: клен серебристый 5 шт. (инв. № 20054001), каштан конский (инв. № 20054004), липа мелколистная, 2 шт. (инв. № 20058473), туя западная, 5 шт. (инв. № 20054006), газоны, 2 шт. (инв. № 20058579)

***Сведения о земельных участках,*** предоставленных продавцу для размещения объектов иного назначения:
1) на праве временного пользования пл. **1,94 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на зем. участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зона линий связи и радиофикации (пл. 0,0268 га), в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0339 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4485 га), канализации (пл. 0,1234 га), теплоснабжения (пл. 0,0322 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0975 га), недвиж. матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,3730 га).
2) на праве долевой аренды (срок действия по 31.03.2026) для размещения технологич. котельной пл. **0,0991 га** с ограничениями

**Обременения по лоту № 2:** площади зданий частично сданы в аренду. Здание с инвентар. номером 500/С-53298 находятся в залоге у банка. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона. Продавец гарантирует освобождение капитального строения (производственный корпус) инв. № 500/С-45217 в течение 36 месяцев

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 13 480 294,80 бел. руб.**
(снижена на 30 %)

**Обременения по лотам:** в соответствии с градостроит. проектом детального планирования, на зем. участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекат., выставочно-музейного, музейно-просветит. назначения

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,07 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.02.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **15.03.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **14.03.2022 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. www.cpo.by.**
**E-mail: auction@cpo.by**

Гісторыя з фатаграфіяй

# НЯСТОМНЫЯ ШУКАЛЬНІКІ СКАРБАЎ

**Гэты здымак (а на ім — злева направа — Ян Скрыган, Уладзімір Урбановіч, Васіль Бондар, Міхась Петрыкевіч і Фёдар Янкоўскі) быў зроблены ў пачатку 1960-х, на беразе Свіцязі, якая заўсёды вабіла шчырых сяброў-аднадумцаў, пісьменнікаў, гісторыкаў, мастакоў, краязнаўцаў...**



Якраз такім быў Уладзімір Урбановіч — настаўнік, аўтар некалькіх кніг і добрай сотні артыкулаў, адзін з заснавальнікаў народнага музея ў Валеўскай сярэдняй школе... Ён шчыра сябраваў з многімі пісьменнікамі. У яго доме, у вёсцы не раз бывалі Янка Брыль, Уладзімір Караткевіч, Алесь Адамовіч, Уладзімір Калеснік, Максім Танк, Барыс Сачанка, Аляксей Карпюк, Анатоль Вярцінскі, Пятрусь Макаль, Генадзь Каханоўскі ды многія іншыя слынныя людзі Беларусі. Аднак часцей за ўсіх гасцілі пісьменнікі, выдатныя літаратура- і мовазнаўцы Ян Скрыган і Фёдар Янкоўскі.

З Фёдарам Міхайлавічам, як расказваў мне Валерый Петрыкевіч, які цяпер жыве ў Дзятлаве, сустрэч было асабліва шмат.

— Мы, валеўскія дзеці, вельмі любілі лавіць рыбу — часам рукамі, з-пад каменяў. «Узбройваліся» кашамі ці таптухамі, — успамінаў спадар Валерый, — і «прафільтроўвалі» ўсе рачныя ямкі аж да суседняй вёскі Мондзіна (цяпер Чаромушкі)... А неяк прыходзім і вачам не верым: на паверхні вады — ледзь жывыя стронгі, ды не маленькія, а з добры селядзец... Мы подбегам па цячэнні... Глядзіш — поўны кош налавілі, схавалі ў крапіве пад кустом. Потым паздымалі з сябе кашулі, пазавязвалі рукавы, рыбай напоўнілі майкі...

Каб данесці здабычу дамоў, спатрэбілася два рэйсы. Улову хапіла і сабе, і суседзям на некалькі дзён. Потым высветлілася, што адзін з трактарыстаў вымыў у рэчцы вялікую бочку, у якой вазіў нейкае вадкае ўгнаенне...

Дык вось, у хуткім часе пасля гэтай «рыбалкі», прыехаўшы ў Валеўку, Фёдар Міхайлавіч адразу ж папрасіў, каб звадзілі яго на месца злачынства. І распытваў там, і ахаў, і любаваўся маляўнічай Неўдай... Праз дзень-другі раніцай і сам ужо выставіў донныя вудачкі... Амаль на кожнай з іх вечарам былі стронгі грамаў па 300—400... Адна мяне здзівіла — даўжынёй з паўметра. Але ж найбольш здзівіў сам рыбак: акуратна зняўшы здабычу з кручкоў да палюбаваўшыся, ён адпускаў рыбу назад у ваду. З сабой узяў толькі дзве моцна параненыя стронгі, каб (яго словы) «Серафіму, жонку маю, парадаваць».

Па дарозе дамоў Фёдар Міхайлавіч меркаваў, што рэчка некалі была паўнаводнай і нашы папярэднікі, напэўна, здабывалі ў ёй не толькі стронгу, але і ласосяў, і харыусаў... А сёння, казаў, трэба біць у званы, каб хімія не трапляла больш у рэкі ды рачулкі. І рыбакам, калі трапіцца на вуду нейкі рэдкі «экзэмпляр», варта адпусціць яго назад у ваду, каб было патомства. Такім вось рыбаком і дабрадушным чалавекам быў прафесар Фёдар Янкоўскі...

Бацька майго суразмоўніка — Міхась Петрыкевіч — заслужаны настаўнік Беларусі ў Валеўцы працаваў намеснікам дырэктара сярэдняй школы, дапамагаў Уладзіміру Урбановічу стварыць краязнаўчы музей, які з часам стаў вядомы на ўсю Беларусь.

Не дзіва, што пра стваральнікаў даведаліся ў суседнім Дзятлаве, што Міхася Фёдаравіча, як той казаў, прыехалі сватаць. Не адразу, але ён пагадзіўся — з сям'ёй перабраўся ў суседні райцэнтр, дзе адразу ж распачаў пошук матэрыялаў для будучага раённага музея.

Пятро Чырко (светлай памяці!) быў у той час дырэктарам раённага Дома культуры і расказваў, як аднойчы ў абед да яго забег усхваляваны Міхаіл Фёдаравіч, як аб'явіў, што на адным з хутароў апытаў жорны, што трэба туды паехаць і тэрмінова забраць... Яно б добра, але на вуліцы — снег, завіруха. Кажу: «Давай пачакаем». Ён — ні ў якую!.. На той хутар мы ледзьве прабіліся, але жорны забралі! Міхась Фёдаравіч быў такі шчаслівы, нібы скарб знайшоў.

Дзякуючы яму, гэтаму нястомнаму шукальніку і збіральніку скарбаў, 5 мая 1968 года быў адкрыты Дзятлаўскі музей народнай славы. Пра яго экспанаты Міхась Фёдаравіч мог расказваць суткамі, і для слухачоў гэта былі самыя займальныя падарожжы ў ваша мінулае.

...Вось такая гісторыя з фатаграфіяй. Застаецца дадаць, што на здымку, сярод знакамітых асоб, настаўнік Васіль Бондар, які потым больш за 20 гадоў (да 1981-га) быў дырэктарам Валеўскай сярэдняй школы.

**Сяргей Чыгрын,**
*г. Слонім.*

**Фота з архіва аўтара.**

Была вайна

# У спісках значыцца

## І гэта ўжо назаўсёды

**Сёлета, чацвёртага сакавіка, Ціхану Максімавічу Барану споўнілася б 90. За плячыма магло б аказацца доўгае і цікавае жыццё: вучоба, выбар прафесіі, работа, стварэнне сям'і... Усё, напэўна, было б, калі б не вайна.**

Ціхан Баран — наш беларускі Сусанін, нарадзіўся на Пружаншчыне ў вёсцы Байкі ў шматдзетнай сялянскай сям'і, змалку дапамагаў бацькам па гаспадарцы, добра вучыўся ў школе, захапляўся гісторыяй.

З пачаткам вайны два яго старэйшыя браты пайшлі на фронт, сярэдні апынуўся ў партызанах. Дапамагаў ім і бацька: збіраў звесткі пра немцаў, арганізоўваў забеспячэнне прадуктамі ды іншымі неабходнымі рэчамі. Побач з хатай, дзе жыла сям'я Барановў, дзейнічаў штаб, працавала падпольная друкарня...

У падпольшчыкаў Ціхан забіраў і распаўсюджваў лістоўкі, збіраў інфармацыю аб колькасці варожых салдат і афіцэраў, іх узбраенні і баявой тэхніцы, перадаваў звесткі ў партызанскі атрад.

Не дзіва, што ўрэшце хлопчыка разам з мамай і сястрычкамі схапілі немцы, больш за месяц трымалі пад вартай, дапытвалі і нават катавалі, пасля чаго маці трапіла ў канцлагер, а знясіленыя дзеці нейкім цудам засталіся на волі, у роднай вёсцы. Дзвюх змучаных і хворых сястрычак прытулілі ў сябе суседзі, Ціхан жа праз нейкі час зноў апынуўся ў партызанскім атрадзе імя Кірава.



Каб расквітацца з народнымі мсціўцамі, фашысты вырашылі знішчыць, сцерці з зямлі вёску Байкі. У ноч з 21 на 22 студзеня (Ціхан якраз выконваў заданне ў роднай вёсцы) яны распачалі карную аперацыю. Амаль тысячу жыхароў (958 чалавек) выгналі на мароз, прымусілі капаць брацкую магілу, падпалілі вёску і пачалі страляць. На вачах у хлопчыка гінулі яго землякі, сваякі, суседзі, яго родныя сястрычкі...

Калі расстрэл скончыўся, гестапавец звярнуўся да Ціхана: ты, маўляў, ведаеш, дзе партызаны, — значыць, завядзеш да іх... І тады вялікая Германія даруе табе жыццё. Мы адправім цябе ў Берлін, ты станеш чалавекам...

Дванаццацігадовы Ціхан паабяцаў паказаць дарогу і сапраўды павёў немцаў — у лес, у гушчар, у непраходнае балота. Праваднік ведаў, што гэтага яму не даруюць, што ён загіне, але разам з ім пакутніцкую смерць прымуць і дзве сотні ворагаў... Такой была помста за маці, за сястрычак, за ўсіх аднавяскоўцаў.

...У Пружанах імя партызана Ціхана Барана носіць адна з вуліц, у адроджанай вёсцы Байкі ўстаноўлены помнік загінулым жыхарам. У спісе значыцца прозвішча піянера Ціхана.

**Мікалай Шаўчэнка,**
*г. Мінск.*

Рэзананс

# «РАБІ, ШТО ТРЭБА, і хай будзе, што будзе»

**Люблю чытаць «Звязду», найбольш — нумары па пятніцах, дзе «...Народ на праводзе!», «Неасабісты суб'ектыў»... Многае тады ўспамінаецца.**

Апошнім часам зачапілі, як той казаў, назіранні за работай гандлю — прадаўцоў, касіраў. З імі мы сутыкаемся ледзь не штодня, і таму хацелася б верыць, што людзі гэта пераважна сумленныя, а памылкі калі і здараюцца, то з-за напльву пакупнікоў, кожнаму з якіх трэба ўсміхнуцца, прапанаваць пакет, прабіць тавары, нешта ўзважыць, палічыць і пры гэтым нічога не пераблытаць... А яно ж здараецца — па сабе ведаю.

...Розныя далікатэсы, у тым ліку сыравэнджаную каўбасу, я сабе не купляю: дорага. Але ж яе вельмі любіць унучка, і парадаваць малую хочацца.

Неяк выбрала невялікую палачку. Да яе ў свой кошык паклала заўсёдныя смятану, хлеб, малако, масла, адстаяла чаргу да касы. Маладая дзяўчына ўсе мае пакупкі прабіла, назвала суму, якую трэба заплаціць. Я дастала з кашалька досыць буйную купюру, каб разлічыцца, а касір усю працягвае мне... рэшту. «Што вы робіце?» — пытаю ў дзяўчыны. Яна толькі вачыма лыпае: хацела б нешта сказаць, але разгубілася — нічога не разумее.

Давялося патлумачыць, потым разлічыцца за пакупкі ды пайсці дамоў, прычым у добрым настроі, бо па дарозе ўспаміналася мама. Яна заўжды нам казала, што, зрабіўшы для некага хай малое, але дабро, узамен атрымаеш большае.

У праўдзівасці гэтых слоў я пераканалася ў той жа вечар, калі перад сном (у мяне завядзёнка такая) выйшла на прагулку. Звычайна я наразаю тры кругі вакол школьнага стадыёнчыка. У той раз толькі павярнула на трэці і ўбачыла на сцежцы... грошы. Першая думка была: «Адкуль, калі нідзе і нікога? Можа, нехта жартуе?» Пастаяла, паглядзела навокал. Як быццам не? Нахілілася, падняла — вырашыла, што муж (ён працаваў у школе) заўтра зробіць аб'яву, і на яе нехта адгукнецца, аднак...

Хто згубіў тыя грошы, засталося загадкай, як і тое, чаму я знайшла іх у той самы дзень, прычым у суме ў два разы большай, чым — не маючы сумлення — магла ўзяць у касіра.

Значыць, мама праўду казала: за малое дабро атрымаеш вялікае. Хаця справа, вядома ж, зусім не ў ім, не ў знаходцы... І не ў словах удзячнасці, пачутых ад той маладзенькай дзяўчыны. Мне прыемна было кіравацца сваім сумленнем. Як там у класікаў? «Рабі, што трэба, і хай будзе, што будзе».

**А. Васільева,**
*г. Гомель.*

Чалавек — чалавеку

# ЯКОЕ СЕМЯ, ТАКОЕ І ПЛЕМЯ?

**Не першы год мы вырошчваем бульбу «Скарб», не першы год успамінаем бабулю. Яна, бедная, адправіўшы мужа на фронт, працавала ад цямна да цямна, каб хоць неяк пракарміцца, зберагчы малых. Найчасцей на стале ў іх была бульбачка з кіслым агуркам.**

Неяк напрадвесні ўсю яе бабуля вынесла з варыўні ў двор, драбнейшую стала адбіраць на насенне.

— Мама, а што ж мы есці будзем? — з трывогай спыталі дзеці.

Сэрца маці зайшлося ад болю: абрэзаўшы з бульбы трохі таўсцейшую лупіну з «вочкамі», яна стала абсыпаць яе попелам, каб потым садзіць, а саму тую абрэзаную бульбу — варыць да есці.

За вочы людзі смяяліся з яе, казалі: нічога ў іх не вырасце! Але...

Прыгрэла сонейка, прайшлі дажджы — і на градцы з'явіліся першыя парасткі...

І потым... Бульба, якую садзілі з такой надзеяй і даглядалі з такой любоўю, не магла не ўрадзіць! Капалі яе, як сапраўды скарб.

...Не ведаю, хто назваў так адзін з айчынных сартоў. Можа, нехта з дзяцей вайны?

**Г. Сцяпанава,**
*Мінскі раён.*

# МОДНАЯ ВЯСНА

## Што будзем насіць, калі пацяплее?

**Абутак на платформе, бліскаўкі і тыгровы прынт... Пагаворым аб стыльных тэндэнцыях надыходзячай вясны. Разабрацца ў тым, што будзе модна зусім хутка, нам дапаможа мастак-стыліст Нацыянальнай школы прыгажосці Святлана МАЧКАДАН.**

І пачнём мы, вядома ж, з абвешчанага моднымі дамамі «вяртання 2000-х» як аднаго з галоўных напрамкаў дызайнерскай думкі на найбліжэйшыя сезоны. Падабаецца нам гэта ці не. Асабіста мне больш даспадобы моднае пераасэнсаванне 1990-х, што натхняла дызайнераў у апошнія гады. Але тут ужо каму што да густу. Тэндэнцыі «нулявых» падабаюцца многім, і яны сапраўды могуць зачараваць сваёй яркасцю і экспрэсіяй — усе тыя топы са стразамі, заніжаная талія, шчыльныя рэчы, празрыстыя сукенкі і іншы «бязлітасны гламур». У рэшце рэшт, чаму б і не?

**Галоўнае — не перастарацца: спалучайце бліскучыя рэчы з базавымі. Напрыклад, міні з бліскаўкамі надзяваем з базавай белай кашуляй, а пералівістыя штаны — з пінжаком-аверсайз.**

— Мода заўсёды была і будзе цыклічнай з'явай. Некалькі сезонаў таму подыумы запаўняліся мадэлямі ў шыракаплечых пінжаках у стылі 1990-х, — тлумачыць Святлана. — Таму вяртанне «нулявых», можна сказаць, было непазбежным. Яго можна толькі прыняць. Гэта была эпоха апантанасці bikini body, цяпер яму прыйдзецца суседнічаць з рухам бодзіпазітыву. Калі вам некамфортна зноў надзець джынсы з нізкай таліяй, не трэба сябе перасільваць. Можна надзець любімыя джынсы з высокай таліяй і, напрыклад, кароткі топ у стылі нядаўніх калекцый Jacquemus. Галоўнае, каб вам было зручна.

З дэвіза «вяртанне нулявых» вынікаюць многія модныя тэндэнцыі вясны: трэнд на міні, кэтсьюты і бліскаўкі. Але аб усім па парадку.

### Прывітанне, нулявыя!

У рэчышчы «вяртання 2000-х» ***міні-спадніцы*** лагічна стануць трэндам вясны і лета. Моднае выказванне дызайнераў на гэтую тэму — напрыклад, мікраспадніцы з заніжанай таліяй ад Miu Miu або вобразы Versace і Fendi з апошніх калекцый. Дарэчы, падобныя мадэлі ўжо з'явіліся ў брэндаў мас-маркета, прадстаўленых у Беларусі. Калі фігура дазваляе — можаце прымяраць. Калі ёсць сумненні адносна апошняга — яшчэ не позна на паспець падцягнуцца ў спартзале. Бо міні





з надыходам цяпла дызайнеры раяць насіць з кроп-топамі.

— Галоўнае спалучэнне гэтага сезона — міні і кароткі топ. Але для прахалоднага надвор'я падыдзе вадалазка-сетка і топ з накінутым пінжаком-аверсайз, грубай джынсавай курткай або бомберам, — распавядае мастак-стыліст Нацыянальнай школы прыгажосці. — Каб лепш упісацца ў «той самы» стыль «нулявых», можна дадаць фактуры. Прынты, махры, скура, бліскаўкі — вашы найлепшыя сябры. Blumarine і Versace пацвярджаюць.

Зрэшты, міні можа быць і не такім экстрэмальным, але, у любым выпадку, не варта хаваць ножкі. Пра тое ж і наступны неадназначны трэнд — ***кэтсьюты***. «Кэт» — гэта кот, «сьют» — касцюм, а кэтсьют — камбінезон «у абліпку» (што адсылае да вобраза «жанчыны-кошкі»). На шчасце, не з бліскучай чорнай скуры. Але і з больш прыстасаваных для звычайнага жыцця матэрыялаў ён амаль не хавае, на жаль, ніякіх дадатковых сантыметраў на таліі, жываце і сцёгнах. Як гэты касцюмчык павінен сядзець у ідэале, можна ўбачыць у «Матрыцы» і «Забіць Біла», а таксама на чырвоных дарожках на галівудскіх знакамітасцях (у новым сезоне кэтсьют стаў адзеннем для выхадаў у свет).

— Пасля піжамнага «каранціннага» стылю пандэмійных гадоў кэтсьют стаў своеасаблівым пратэстам. Нам усім хочацца чагосьці дзёрзкага, — кажа Святлана. — Хочацца быць сексуальнымі, упэўненымі і смелымі, хочацца адысці ад нормкора.

Нормкор — тэндэнцыя ў модзе, якая прапануе падкрэслена функцыянальны і камфортны стыль адзення. У апошнія гады была папулярная ідэя, што адзенне дадзена чалавеку не для таго, каб з яго дапамогай вылучацца. І вось гэтай вясной мода раіць нам менавіта вылучацца — здзіўляць, уражваць, быць у цэнтры ўвагі. Адчуўшы цікавасць публікі да камбінезонаў у абліпку, дызайнеры ў сваіх апошніх калекцыях прадставілі розныя варыяцыі і версіі — прынтаваныя ад Prada і Marine Serre, яркія ад Balenciaga... Ці прыжывецца гэты нясціплы трэнд сярод нашых сціплых бярозак? Пакуль незразумела. Хутчэй, не. І ўсё ж давайце высветлім, як упісаць кэтсьют у штодзённы вобраз.

— Кэтсьют выдатна дапаўняецца шырокімі паясамі, міні-спадніцамі, штанамі. Можна проста надзець зверху жакет, лёгкі трэнч або нават паліто, — тлумачыць Святлана.

***Бліскаўкі*** — таксама пра «вылучацца». Насіць іх гэтай вясной можна і на баль, і на работу, і ніхто не папракне вас, што гэта «маветон». Галоўнае — не перастарацца: спалучайце бліскучыя рэчы з базавымі. Напрыклад, міні з бліскаўкамі надзяваем з базавай белай кашуляй, а пералівістыя штаны — з пінжаком-аверсайз.

— Бліскаўкі — гэта тое свята, якога нам не хапала. Неабавязкова даставаць зіхатлівую сукенку толькі ў асаблівых выпадках, бліскаўкі падыходзяць і для штодзённага вобраза. Офісны стыль разбаўляем бліскучай блузкай. Аддаць даніну «трэнду на русалак» можна, надзеўшы доўгую максі-спадніцу ў бліскаўках пад свабодную кашулю або базавую футболку. Галоўнае, каб да вашага яркага і зіхатлівага прадмета гардэробу дадавалася нешта больш простае або строгае — гэта ўраўнаважыць вобраз.

Яшчэ адна модная прыкмета вяртання «нулявых» — ***брыджы***. Памятаеце, мы іх насілі два дзесяцігоддзі таму? І вось прыйшоў час зноў прымяраць шчыгульныя кароткія штонікі (у процівагу «леташнім» кюлотам і бермудам). Каб не «абрэзаць» сабе ногі, сачыце, каб брыджы не заканчваліся на самай шырокай частцы галёнкі. І, вядома, ніякіх гарызантальных складачак на іх быць не павінна — лепш узяць памер крыху большы. Брыджы носім яркіх адценняў. Але актуальныя і мадэлі з дэніму класічных «джынсавых» колераў. Спалучаем іх з трэндавым абуткам на платформе.



Вяртанне платформы — бадай, галоўная радасць будучага моднага сезона. Платформу любілі ўсе — і высокія «каралеўны», і мініяцюрныя «дзюймовачкі». Нягледзячы на рызыку пераламаць сабе шчыкалаткі, ***абутак на платформе*** ў 2000-х надзявалі і ў галалёд, і ў спякоту. Яшчэ б — у такім абутку практычна любы сілуэт выглядае стройным і нават мадэльным. І вось платформа ў маючым адбыцца сезоне — проста сімвал моднага абутку. Яна зноў з намі! Падыдуць боты, туфлі, басаножкі: галоўнае, каб платформа была высокай і масіўнай, а колер — пажадана яркі і сакавіты.

### Тыгрыцы на прагулцы

Калі вы ніколі ў жыцці не насілі рэчы з анімалістычнымі прынтамі (усе гэтыя «пітоны» і «леапарды»), то ў новым сезоне самы час змяніць сваё стаўленне да трэнду. Справа ў тым, што на подыумах пануе ***тыгровы прынт***. Афарбоўка «татэмнай жывёліны» 2022 года натхніла дызайнераў на стварэнне самых розных прадметаў гардэробу: ад верхняга адзення да сукенак і блузак, сумак



і абутку. Выглядае трэнд, дарэчы, ярка, пры гэтым стрымана і элегантна.

— Трэнд на анімалістычныя прынты не памрэ, напэўна, ніколі, але ў гэтым сезоне пітонаў, зебраў і леапардаў зрушыў з пастамента тыгр. Для самых смелых падыдзе анімалістычны total look у натуральных «тыгровых» колерах з якім-небудзь кантрасным аксесуарам. Але для штодзённага нашэння падыходзіць нейкая адна «звярыная» рэч у вобразе. Не менш актуальныя ў бягучым сезоне абстракцыі. Спалучэнні каляровых плям, мармуровы малюнак, кветкі і, вядома ж, геаметрычная абстракцыя (як строгія лініі, так і хаатычныя) дапамогуць стварыць вобраз, які адразу выдзеліць вас з натоўпу, — распавядае Святлана.

А калі казаць пра ***модныя колеры...***

— Галоўным колерам на вясну-лета гэтага года стаў белы. Следам за ім ідуць асвяжальныя і лёгкія блакіт і мята, далікатна-ружовы і лаванда. Кантрасту дададуць аранжавы і насычаны сіні. Выкарыстоўваць гэтыя колеры і іх адценні можна ў рамках трэнду каларблок. Ужо больш за 50 гадоў дадзены трэнд існуе ў свеце моды, сышоўшы з карцін мастакоў-абстракцыяністаў. Каб стварыць вобраз у стылі каларблок, лепш выбіраць рэчы найбольш простага і свабоднага крою і абмежаваць сябе ў аксесуарах. Аптымальна падыдуць прамы сілуэт і сілуэт трапецыя. Можна адзецца ў каляровы total look, а можна ўзяць рэчы ў адценнях аднаго колеру альбо ў колерах, процілеглых на каляровым крузе.

### Трэба быць больш сціплымі?

***Каларблок*** — адна з найбольш актуальных модных тэндэнцый сезона. Яго рысы — яркія насычаныя колеры, лаканічны, зразумелы крой і адсутнасць дадатковага дэкору або прынтаў. Трэнд спадабаецца тым, хто не лічыць сябе прыхільнікамі «экстрыму» (накшталт кроп-топаў у спалучэнні з міні з заніжанай таліяй або кэтсьютаў) і імкнецца да больш класічнага разумення прыгажосці. Бо ў аснове стылістычнага напрамку — класічныя сілуэты, дарэчны ў любой абстаноўцы.

Для іх жа — антытэза трэнду на міні, ***спадніцы-максі***, якія таксама будуць вельмі актуальныя гэтай вясной. Іх у новым цёплым сезоне выбіраем, што называецца, да зямлі. Найбольш трэндавыя мадэлі — з заніжанай таліяй, лаканічных колераў, струменістыя і жаноцкія.

Як бачым, модніцам ёсць з чаго выбраць. Галоўнае — любы трэнд перш за ўсё прымяраць да свайго ўнутранага «я», да ўласнага бачання прыгажосці і стылю. І не баяцца быць крэатыўнымі.

— Памятайце, што самы галоўны трэнд сезона — спалучаць неспалучальнае, — падкрэслівае мастак-стыліст Нацыянальнай школы прыгажосці. — Не азірайцеся на свой узрост і не абмяжоўвайце сваю фантазію!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Скажыце, доктар...

# IgM + IgG

## Ці ведаеце вы, што гэта значыць?

**Пандэмія каранавіруса змяніла жыццё амаль усёй планеты ў цэлым і кожнага з нас у прыватнасці. Часта інфекцыя праходзіць без сімптомаў ці ў лёгкай форме. Як даведацца, перахварэлі вы ці не, ці з'яўляецеся бяспечнымі для навакольных? Гэтыя пытанні хваляюць многіх. Прайшло дастаткова часу, і з'явілася магчымасць атрымаць адказ на такія пытанні. Цяпер у продажы маецца некалькі варыянтаў экспрэс-тэстаў на каранавірус, і пры жаданні праверыцца можа кожны. Здаць такі аналіз можна і ў лабараторыях. Пра лабараторную дыягностыку каранавіруснай інфекцыі і інтэрпрэтацыю вынікаў аналізаў расказала ўрач клінічнай лабараторнай дыягностыкі вышэйшай катэгорыі 11-й сталічнай паліклінікі Святлана ПАЛЬЧУК.**

***— Святлана Адамаўна, якімі метадамі ўвогуле цяпер можна выяўляць каранавірусную інфекцыю?***

— Тэсціраванне на каранавірусную інфекцыю праводзіцца двума метадамі: малекулярнае распазнаванне і сералагічнае даследаванне. Малекулярныя метады выкарыстоўваюць палімеразную ланцуговую рэакцыю (ПЛР). Пры сералагічным тэсціраванні выкарыстоўваюцца тэсты, якія дапамагаюць выявіць антыцелы імуннай сістэмы супраць віруса. Такім чынам, сералагічнае тэсціраванне — гэта ацэнка імуннага статусу чалавека на ўкараненне інфекцыі.

Залатым стандартам у дыягностыцы каранавіруснай інфекцыі, безумоўна, з'яўляецца метад ПЛР. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што генетычная інфармацыя віруса (РНК) шматразова капіруецца ў лабараторных умовах спецыяльным прыборам — ампліфікатарам, павялічваючы сваю канцэнтрацыю ў два разы ў кожным цыкле капіравання. Гэта дае магчымасць выявіць вірус або бактэрыю нават у тых выпадках, калі іх колькасць складае ўсяго толькі сотню клетак у мілілітры біялагічнага матэрыялу. Калі генетычная інфармацыя той ці іншай бактэрыі ці віруса ў спробе адсутнічае, то яна не капіруецца і не вызначаецца.

Аналіз метадам ПЛР звычайна праводзіцца тым, у каго ёсць сімптомы рэспіраторнага захворвання або тым, хто меў кантакты з крыніцай інфекцыі для ўстанаўлення факта захворвання ці пацвярджэння дыягназу. Адсутнасць генетычнага матэрыялу ўзбуджальніка (адмоўны вынік) азначае, што чалавек не інфіцыраваны на момант узяцця аналізу.

***— Ці можна выявіць вірус адразу пасля заражэння, нават калі ў чалавека яшчэ няма праяў хваробы?***

— Можна. Таму, калі тэст адмоўны, але сімптомы прысутнічаюць, не трэба чытаць артыкулы, варта звярнуцца да ўрача. Спецыфіку ходу любой інфекцыі ніхто не адмяняў. Урач будзе выкарыстоўваць дадатковыя метады даследавання і ставіць дыягназ. Не варта займацца самадыягностыкай.

***— Якой мусіць быць падрыхтоўка да ПЛР-тэста?***

— Узяцце біяматэрыялу робіцца нашча ці не раней, чым праз дзве гадзіны пасля прыёму ежы, да паласкання ці арашэння лекавымі сродкамі. Таксама не рэкамендуецца перад аналізам паласкаць рот, чысціць зубы, курыць. Даследаванне рэкамендуецца праводзіць да пачатку супрацьвіруснага лячэння. За 24 гадзіны да ўзяцця матэрыялу не рэкамендуецца прымяняць ніякія мясцовыя формы лекавых прэпаратаў.

***— Якія існуюць экспрэс-тэсты? У чым іх перавагі і недахопы?***

— Існуе два тыпы экспрэс-тэстаў на COVID-19. Першыя — гэта тэсты для непасрэднага выяўлення антыгену SARS-CoV-2, якія вызначаюць наяўнасць кампанентаў самога віруса, тут робіцца мазок з носа- і ратаглоткі. Другія — тэсты выяўлення антыцел (яны найбольш распаўсюджаныя ў экспрэс-дыягностыцы) — гэта непрамыя тэсты па выяўленні імунаглабулінаў у сываратцы крыві. Экспрэс-тэсты праводзяцца метадам імунахраматаграфіі (ІХА) і не патрабуюць выкарыстання спецыяльнага абсталявання.

Тэсты на вызначэнне спецыфічнага антыгену віруса SARS-CoV-2 сталі адной з апошніх распрацовак. У іх ёсць як перавагі, так і недахопы. З аднаго боку, яны больш даступныя і вынік можна атрымаць проста на месцы тэсціравання за 20 хвілін. З другога, адчувальнасць гэтых тэстаў ніжэйшая ў параўнанні з ПЛР, таму вынік тэста на антыген, як правіла, непасрэдна залежыць ад віруснай нагрузкі. Антыген-тэсты ў мазку з наса-, ратаглоткі выяўляюць бялкі каранавіруса SARS-CoV-2, якія сінтэзуюцца падчас рэплікацыі, і вынік таксама вельмі залежыць ад якасці і месца ўзяцця матэрыялу. Сёння шматлікія кампаніі па ўсім свеце занятыя распрацоўкай тэстаў для выяўлення антыгенаў каранавіруса SARS-CoV-2.

***— Растлумачце, што такое антыцелы IgM, IgA і IgG.***

— Як і іншыя вірусныя інфекцыі, каранавірус стымулюе гумаральны і клетачны імунны адказ (IgM, IgA і IgG). Пасля пранікнення віруса ў арганізм у крыві хворага пачынаюць з'яўляцца спачатку імунаглабулін класа IgA, IgM, пазней — імунаглабулін класа G (IgG), пасля чаго актывізуецца імунітэт, і клеткі імуннай сістэмы атакуюць уласныя клеткі, заражаныя вірусам. Антыцелы класа M з'яўляюцца ў вострай фазе захворвання, на 3-5 дзень, і знікаюць прыкладна праз 12 тыдняў ад пачатку захворвання. Антыцелы IgA больш спецыфічныя, выпрацоўваюцца выключна на каранавірусы. Асноўная мэта імунаглабуліну A (IgA) — абараніць нашы слізістыя абалонкі ад каранавіруса. Іх узровень зніжаецца пасля выздараўлення.



Антыцелы класа G з'яўляюцца на 6-10 суткі ад пачатку захворвання і трымаюцца некаторы час, працягласць гэтага часу індывідуальная, але працэс займае два-тры месяцы.

***— Каму паказаны тэсты на выяўленне антыцел?***

— Тым, хто хоча даведацца, перанёс ён інфекцыю ці не, незалежна ад таго, былі прыкметы прастуды ці не. Толькі трэба разумець, што калі былі падазроныя прыкметы, мэтазгодна абследавацца на IgG праз пяць тыдняў ад меркаванага перыяду. Калі прыкмет не было, тэрміны неістотныя, абследуйцеся ў любы час.

Таксама варта правесці іх тым, хто падазрае хваробу цяпер ці перанёс яе ў нядаўнім часе, нават калі праводзілі даследаванне мазка метадам ПЛР і ён паказаў адмоўны вынік. Часам такое бывае.

***— Ці патрэбная спецыяльная падрыхтоўка для вызначэння антыцел да каранавіруса?***

— Не патрэбная. Для даследавання ў лабараторных умовах здаецца вянозная кроў раніцай нашча або днём праз тры гадзіны пасля ежы. Чыстую ваду без газу піць можна. Чай, каву, сок — забараняецца.

Звяртаю ўвагу, што ўсе вынікі даследаванняў павінен інтэрпрэтаваць урач, бо паўнавартасная карціна складаецца з даных гісторыі хваробы, агляду, лабараторных і інструментальных даных.

### Як правільна прачытаць вынік аналізу на антыцелы

**Калі IgM (+) знойдзены, IgG (-) не знойдзены:**

• можа быць прыкметай вострай інфекцыі, асабліва пры наяўнасці прыкмет захворвання;

• магчымы лжывастаноўчы вынік (пры хранічных захворваннях).

Таму мэтазгодна правесці даследаванне мазка з зеву метадам ПЛР. Калі вынік ПЛР адмоўны ці няма прыкмет хваробы, паўтарыць тэст на антыцелы праз 2-3 тыдні.

**Калі IgM (+) выяўлены, IgG (+) выяўлены:**

• магчымая інфекцыя проста цяпер, пачатак выздараўлення або нядаўна перанесенае захворванне.

**Калі IgM (-) не выяўлены, IgG (+) выяўлены:**

• сведчыць аб перанесеным раней COVID-19.

**Калі IgM (-) не выяўлены, IgG (-) не выяўлены:**

• пацыент яшчэ не сустракаўся з вірусам.

**Антыцелы IgA і IgM да каранавіруса SARS-CoV-2**

Гэта паўколькасны метад, тут прымяняецца імунаферментны аналіз.

IgA — паказчыкі ранняй інфекцыі, з'яўляюцца больш дакладнымі ў адрозненне ад IgM, паколькі больш спецыфічныя.

Станоўчы вынік — больш за 1,1. Гаворыць аб выяўленні IgA і можа азначаць:

• інфекцыю цяпер (у прыватнасці, бессімптомны ход);

• калі адначасова вызначаюцца IgG, то гэта або перыяд выздараўлення, або нядаўна перанесеная інфекцыя.

Памежны вынік — у інтэрвале 0,8 — 1,1. Патрабуе паўторнага даследавання праз два тыдні, паколькі можа азначаць пачатковы перыяд інфекцыі, калі не паспелі сфарміравацца антыцелы ў дастатковай колькасці. Як правіла, у такім выпадку ёсць прыкметы хваробы і патрабуецца пацвярджэнне метадам ПЛР (мазок з зеву). Тады праз два тыдні будзе адзначацца нарастанне IgA.

Адмоўны вынік — менш за 0,8. Або азначае адсутнасць антыцел IgA, што магчыма, калі:

• пацыент не сустракаўся з каранавірусам SARS-CoV-2;

• самы пачатак хваробы, калі яшчэ няма імуннага адказу. Пры наяўнасці праяў правільна даследаваць мазок з зеву на ПЛР.

**Антыцелы IgG да каранавіруса SARS-CoV-2**

Гэта паўколькасны метад, таксама прымяняецца імунаферментны аналіз.

Станоўчы вынік — больш за 1,1. IgG выяўлены ў наступных выпадках:

• сфарміраваны імунітэт пасля даўно перанесенай інфекцыі. Тады антыцелы IgM і IgA адсутнічаюць;

• інфекцыя ў стадыі выздараўлення або нядаўна перанесеная — калі вызначаюцца адначасова IgA і/або IgM.

Памежны вынік — у інтэрвале 0,8 — 1,1.

Магчыма, IgG яшчэ няшмат, што вымагае паўтарыць даследаванне праз два тыдні.

Адмоўны вынік — менш як 0,8.

IgG не выяўлены, і гэта можа значыць, што:

• не было «сустрэчы» з SARS-CoV-2 (тады няма IgA, IgM);

• вострая інфекцыя. Пры наяўнасці праяў варта праверыць IgA, IgM і мазок на ПЛР.

Выяўленне антыцел класа IgG кажа аб наяўнасці імуннага адказу на «сустрэчу» з інфекцыяй у мінулым і з'яўляецца прыкметай перанесенага захворвання.

А вы ведалі?

# ЯК ПАЛЕПШЫЦЬ СВАЮ ПРАЦАЗДОЛЬНАСЦЬ?

**Працаздольнасць — гэта функцыянальныя магчымасці нашага арганізма. Яна характарызуецца колькасцю і якасцю работы, якую мы выконваем за пэўны час пры максімальна інтэнсіўным напружанні. Узровень функцыянальных магчымасцяў чалавека залежыць ад яго ўмоў працы, стану здароўя, узросту, ступені трэніраванасці, матывацыі да работы і іншых фактараў.**

Як тлумачыць **памочнік урача-гігіеніста аддзела гігіены Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Таццяна ЛЯШКЕВІЧ**, працаздольнасць вагаецца на працягу рабочага дня і мае некалькі фаз.

**Першая** — фаза ўцягнення ў работу, пры якой паляпшаюцца псіхафізіялагічныя паказчыкі і вынікі работы, доўжыцца ад некалькіх хвілін да 1,5 гадзіны.

**Другая** — фаза высокай устойлівай працаздольнасці, для якой характэрнае спалучэнне высокіх працоўных паказчыкаў з адноснай стабільнасцю напружанасці фізіялагічных функцый, доўжыцца 2-2,5 гадзіны.

**Трэцяя** — фаза зніжэння працаздольнасці, якая характарызуецца пагаршэннем стану сардэчна-сасудзістай сістэмы, павелічэннем часу праходжання рэфлексаў, зніжэннем увагі, запаволеннем хуткасці рашэння задач, назіраецца да абедзеннага перапынку.

Характэрна, што такая дынаміка працаздольнасці паўтараецца і пасля абедзеннага перапынку.

Што можа дапамагчы работніку, улічваючы дынаміку працаздольнасці, максімальна якасна выконваць сваю работу?

Найперш — рацыянальная арганізацыя рабочага месца. Канструкцыя вытворчага абсталявання і арганізацыя рабочага месца павінны адпавядаць нашым антрапаметрычным даным і псіхафізіялагічным магчымасцям.

Па-другое, нельга дасягнуць высокай працаздольнасці без трэніроўкі. Таму, паўтараючы дзень пры дні дзеянні, якія патрабуе работа, мы ўдасканальваем свае ўменні і навыкі.

Па-трэцяе, прытрымлівайцеся рацыянальнага рэжыму працы і адпачынку. Гэта або ўвядзенне абедзеннага перапынку ў сярэдзіне рабочага дня, або кароткачасовыя рэгламентаваныя перапынкі.

Дапамагае і вытворчая фізкультура. Некалькі практыкаванняў на 5-7 хвілін спрыяюць хутчэйшаму ўваходжанню ў работу. Фізкультпаўзы праводзяцца як падчас зніжэння працаздольнасці, так і для зніжэння стомленасці асобных органаў. Асабліва яны неабходныя для тых, хто займаецца разумовай працай. Гэта комплекс практыкаванняў для мышцаў шыі, спіны, рук, ног, дыхальныя практыкаванні.

Добра, калі ў вас на рабоце ёсць пакоі псіхафізіялагічнай разгрузкі. За кошт эстэтычнага афармлення інтэр'ера, зручнай мэблі, праслухоўвання класічных музычных твораў, прыёму танізавальных напояў, дэманстрацыі слайдаў з краявідамі прыроды і перадачы гукаў лесу, марскога прыбою дасягаецца эфект псіхаэмацыяльнай разгрузкі.

## Дукорский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области

**5 апреля 2022 года в 15.00** в здании Дукорского сельского исполнительного комитета, расположенного по адресу: аг. Дукора, ул. Речная, д. 14 Пуховичского района Минской области **проводит открытый аукцион по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Наличие ограничений | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1.** аг. Дукора, пер. Школьный, 7, 624483402101001634 | 0,1458 | Сети электроснабжения, газоснабжения | | 1447,30 + расходы за объявление в СМИ | 18000,00 | 1800,00 |

Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на р/с BY23AKBB36006250900060000000, УНП 600537220, код платежа 04901 (частная собственность).

**Получатель:** главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области.

**Банк:** ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBB BY2X

**Участники аукциона должны предоставить следующие документы:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенных банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица и доверенность, заверенную нотариально в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).
4. Заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **17.00 30 марта 2022 года по вышеуказанному адресу.**

Аукцион состоится при наличии не менее двух участников.

Победитель аукциона обязан:

- в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона осуществить оплату за земельный участок и расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения;
- в течение двух месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона, либо признания аукциона несостоявшимся, обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок;
- получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ, разработать и утвердить строительный проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий два года.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, выставленными на аукцион, путем выезда на место нахождения участка.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

**Контактные телефоны: (801713)63935, 99436, 99322.**

**Сайт Пуховичского райисполкома.**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже конфискованного имущества 29 марта 2022 года

| № лота | Наименование и местонахождение недвижимого имущества | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инвентарным номером 412/С-1861 (наименование – жилой дом).** Местонахождение недвижимого имущества: Гродненская область, Мостовский район, Дубненский с/с, д. Сухиничи, ул. Стельмаховская, д. 50 | 1 080,00 | 108,00 |

Имущество продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь. Организация и проведение аукциона проходит в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утверждённым Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63 «О совершенствовании работы с имуществом, изъятым, арестованным или обращенным в доход государства».

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел.: (0152) 626055, 626056.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %. Условия продажи отсутствуют.

Уполномоченный орган, и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом. К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов. Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Аукцион состоится 29 марта 2022 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 – 17.00 **с 1 марта по 23 марта 2022 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 626055, 626056.

Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **http://gki.gov.by/,** Гродненского городского исполнительного комитета **http://www.grodno.gov.by,** ГП «Гродненский центр недвижимости» **http://gcn.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Продавец** | **ИООО «АРВИБЕЛАГРО», Гродненская обл., Лидский р-н, Лидский с/с, М-11, 39-й км, 5, 8 (тел. +375 29 130-85-30) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 81-4Б/2020** |

**Предмет аукциона**

**КОМПЛЕКС ПО ПРОМЫШЛЕННОМУ ПРОИЗВОДСТВУ ПРОДУКЦИИ ИЗ МЯСА ИНДЕЙКИ ИООО «АРВИБЕЛАГРО»**

Состав имущества см. на сайте ipmtorgi.by

Месторасположение объектов недвижимости, входящих в состав комплекса:

1) завод «АРВИБЕЛАГРО» по промышленному производству продукции из мяса индейки, площадь участка 16.7324 га – Гродненская обл., Лидский р-н, М-11, 39-й км, 5;

2) комплекс по промышленному производству продукции из мяса индейки, площадь 5.3229 га – Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, 20, площадка № 6;

3) комплекс по промышленному производству продукции из мяса индейки, площадь 6,0209 га – Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, 19, площадка № 5;

4) ферма для откорма индейки, площадь 6,4989 га – Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, 21, площадка № 7:

5) пометохранилище, площадь участка 1,1262 га – Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, в районе д. Жомойди.

С перечнем земельных участков, отведенных под инженерные коммуникации, можно ознакомится на сайте ipmtorgi.by

**Начальная стоимость без НДС – 33 449 104,07 бел. руб.**
(снижена на 10 %)
Шаг аукциона без НДС – 1 672 455,20 бел. руб.

**Обременения:** на территории земельного участка завода «АРВИБЕЛАГРО» (кадастровый номер 423684300049000010) расположены два объекта незавершенного строительства, которые не входят в состав лота и будут демонтированы для реализации в качестве строительных материалов. Освобождение земельного участка от данных объектов возможно после их реализации.

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Залуцкая Анна Леонидовна, тел. +375 44 7148418; Симонова Регина Владимировна, тел. +375 29 3974469 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17:00:00 **17.03.2022** заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 выше указанного Закона.

Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

Порядок оформления результатов торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол.

В случае если торги признаны несостоявшимися в связи с тем, что на участие в них подано заявление только одним участником торгов либо для участия в них явился только один участник, в протокол вносится информация о согласии на покупку этим участником торгов предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

В случае неисполнения Покупателем обязательств по оплате цены договора (отказа, уклонения от заключения договора купли-продажи, отказа от исполнения, неисполнения договора купли-продажи) сумма задатка остается у Продавца в порядке ст. 352 Гражданского кодекса Республики Беларусь.

Покупатель осуществляет принятие имущества в месте его нахождения собственными силами и за свой счет по его фактическому состоянию без каких-либо дополнительных условий. Все расходы по заключению, оформлению и регистрации договоров купли-продажи, расходы по государственной регистрации перехода права собственности на имущество, снятию с учета и постановке на учет имущества несет Покупатель

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | После возмещения фактических затрат на организацию и проведение торгов в течение 20 (двадцать) рабочих дней со дня проведения торгов |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере 0,2 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте ipmtorgi.by

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 05.01.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия, но не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов

**Аукцион состоится 18.03.2022** в **11:00:00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9:00:00 02.03.2022 по 17.03.2022 до 17:00:00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704-92-06, www.cpo.by. E-mail: info@ipmtorgi.by**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛАРУСЬРЕЗИНОТЕХНИКА»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Беларусьрезинотехника»** (УНП 700069297) 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего Шпакова Олега Петровича.

Повторные электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу №15-11/Б/2019/6 в экономическом суде Могилевской области будут проведены: **17 марта 2022 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Станок трубогибочный, инв. № 6038 | 792,00 | 132,00 |
| 2 | Воздушный ресивер 6000х2000 (20 м. куб.) – 3 т., б/у, инв. № 10051122 | 4116,00 | 1176,00 |
| 3 | Воздушный ресивер 6000х2000 (20 м. куб.) – 3 т., б/у, инв. № 10051122 | 4116,00 | 1176,00 |
| 4 | Воздушный ресивер 6000х2000 (20 м. куб.) – 3 т., б/у, инв. № 10051122 | 4116,00 | 1176,00 |
| 5 | Воздушный ресивер 5000х2000 (15 м. куб.) – 2,5 т., б/у, инв. № 10051121 | 2688,00 | 768,00 |
| 6 | Воздушный ресивер 5500х1500 (10 м. куб.) – 1,6 т., б/у, инв. № 10051124 | 2436,00 | 696,00 |
| 7 | Воздушный ресивер 3000х1000 (2,5 м. куб.) – 0,6 т., б/у, инв. № 10051123 | 596,40 | 170,40 |
| 8 | Емкость-миксер-6000х2500 (30 м. куб.) – 1,3 т., б/у, инв. № 10051128 | 1428,00 | 408,00 |
| 9 | Ресивер (цех № 7) – 4500х1500 (22 м. куб.) – 0,5 т., б/у, инв. № 10051118 | 4368,00 | 1248,00 |
| 10 | Ресивер (цех № 7) – 4500х1500 (22 м. куб.) – 0,5 т., б/у, инв. № 10051118 | 4368,00 | 1248,00 |
| 11 | Валок заготовка 610х800, б/у, инв. № 10509166 | 5460,00 | 1560,00 |
| 12 | Валок заготовка 610х800, б/у, инв. № 10509166 | 5460,00 | 1560,00 |
| 13 | Вальцы 800 Рифайнер, бывшие в эксплуатации, инв. № 4043 | 14880,00 | 7440,00 |
| 14 | Вальцы 800 Рифайнер, бывшие в эксплуатации, инв. № 4045 | 14880,00 | 7440,00 |
| 15 | Вальцы 800 Рифайнер, бывшие в эксплуатации, инв. № 4047 | 14880,00 | 7440,00 |
| 16 | Вальцы 800 Рифайнер, бывшие в эксплуатации, инв. № 4048 | 14880,00 | 7440,00 |
| 17 | Вальцы 800 Рифайнер, бывшие в эксплуатации, инв. № 4049 | 14880,00 | 7440,00 |
| 18 | Электрокара ЕП-011, 1987 г. в., бывшая в эксплуатации, инв. № 9161 | 4320,00 | 2160,00 |
| 19 | Электрокара ЕС-301, 1986 г. в., бывшая в эксплуатации, инв. № 9159 | 8448,00 | 4224,00 |

**Местонахождение предметов торгов – Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, тел. для ознакомления +375 29 698-53-53.**

Для участия в торгах необходимо в срок с 03.03.2022 г. 09.00 по 16.03.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 календарных дней со дня завершения электронных торгов. Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет торгов в соответствии с условиями договора купли-продажи, но не позднее 30 календарных дней, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

## Информация о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества РУП «Белтаможсервис»

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 5100763, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

**Лот № 1**. Право заключения договора аренды сроком на 3 года:

- капитального строения, инв. № 210/С-11468 (наименование – здание склада, составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие, ж/б ограждение, металлическое ограждение) площадью 372 кв. м по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Дзержинского, д. 85. Размер коэффициента к базовой арендной ставки – 2,0. Размер арендной платы кап. строения № 210/С-11468 – 148,8 базовых арендных величин в месяц. Целевое использование: для размещения складского помещения, организации производства (кроме вредных производств), организации розничной торговли непродовольственными товарами, оказания услуг.
- капитального строения, инв. № 210/С-11467 (наименование – здание нежилое – одноэтажное кирпичное здание КПП) площадью 16 кв. м по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Дзержинского, 85. Размер коэффициента к базовой арендной ставки – 2,0. Размер арендной платы кап. строения № 210/С-11467 – 6,4 базовых арендных величин в месяц. Целевое использование: для оказания услуг.

**Нач. цена: 1147,51 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения аукциона: 18.03.2022 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Извещение о проведении открытого аукциона опубликовано 25.02.2022 на сайте Государственного комитета по имуществу http://www.gki.gov.by/, https://au.nca.by/ (№ 8810), на сайте Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by.

УНП 390477566

*Финансово-образовательный местный фонд «УоллСтрит» (далее – Фонд) зарегистрирован решением Главного управления юстиции Минского городского исполнительного комитета № 16 от 03 мая 2016 г. Свидетельство о государственной регистрации № 05/0082. Учетный номер плательщика 194904583. Адрес местонахождения: 220140, г. Минск, ул. Домбровская, д. 9, офис 9.1.4.*

## ОТЧЕТ
### об использовании финансово-образовательным местным фондом «УоллСтрит» своего имущества за 2021 год

Учредителями Фонда являются граждане Республики Беларусь (два физических лица).

Стоимость имущества Фонда по состоянию на 01 января 2022 года составляет 398 611,11 белорусского рубля. Фонд не создавал, не учреждал и не участвовал в унитарных предприятиях и хозяйственных обществах.

В 2021 году Фонд производил следующие виды расходов: на оплату труда работников; на материально-техническое обеспечение; использование денежных средств и иного имущества. Всего было израсходовано денежных средств на сумму 256 483,83 белорусского рубля.

Фонд получил поступления денежных средств от осуществляемой в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности и от иных поступлений, не запрещенных законодательством, в размере 260 200,05 белорусского рубля.

Бацькаўшчына

*У пошуках страчанага*

# ВІРТУАЛЬНЫЯ СУСТРЭЧЫ Ў НАВАГРУДКУ

**Некалькі гадоў таму лёс звёў мяне з цікавым расійскім літаратарам Мікалаем Андрэевічам Чаркашыным... Вось і нядаўна ён пазваніў з Масквы. Пісьменнік-марыніст. Ваенны журналіст. Нарадзіўся на Гродзеншчыне, у Ваўкавыску ў 1946 годзе. Служыў у Ваенна-марскім флоце намеснікам камандзіра па палітычнай частцы на падводнай лодцы. Часта бывае ў Беларусі. Напісаў некалькі кніг, звязаных з ваеннай гісторыяй нашай Айчыны. У раманах Мікалая Андрэевіча дэталёва апісаны падзеі 1941 года на Гродзеншчыне. «Хацелася б хутчэй наведацца ў Навагрудак», — сказаў Мікалай Андрэевіч. Ён і раней неадночы прыязджаў на радзіму Адама Міцкевіча, добра ведае музей паэта.**

Расказаўшы пра гэты званок навагрудскаму краязнаўцу, апантанаму збіральніку памяці пра класіка польскай і беларускай літаратур Міколу Гайбе, я пачуў у адказ: «Арганізуем сустрэчу з Мікалаем Андрэевічам, пакажам яму Навагрудак і Навагрудчыну літаратурную. Горад і наша старонка звязаныя з імёнамі многіх пісьменнікаў. Тут і акрамя Міцкевіча шмат цікавых асоб. Была б магчымасць перанесціся віртуальна ў часіны іншыя, мы шмат каго сустрэлі б на вулках горада...»

Давайце і мы паспрабуем успомніць, хто ж з паэтаў, празаікаў, літаратуразнаўцаў мае дачыненне да старажытнага горада. Вядома ж, у Навагрудку хапае адрасоў, звязаных з імем Адама Міцкевіча. Пры мясцовым кляштары з 1751 да 1831 года дзейнічала дамініканская школа. У 1807 — 1815 гадах у ёй вучыўся аўтар «Пана Тадэвуша». Разам з Адамам Міцкевічам у школе дамініканцаў вучыўся і Ян Чачот, будучы паэт, збіральнік фальклору. Праз гады Ігнат Дамейка напіша пра двух легендарных вучняў: «Два нашыя студэнты Навагрудскай школы з гадоў маленства добра ведалі літоўскі люд, палюбілі яго песні, прасякнуліся яго духам і паэзіяй, да чаго, вядома ж, прычыніўся і тое, што малое мястэчка Навагрудак не шмат чым адрозніваласся ад нашых вёсак і засценкаў. Школьнае жыццё было хутчэй сельскае. Сябры хадзілі на кірмашы, царкоўныя ўрачыстасці, бывалі на сялянскіх вяселлях, дажынках і хаўтурах. У тыя школьныя часы ўбогая страха і народная песня распалілі ў абодвух першы паэтычны агонь. Адам хутка ўзнёсся да высокай сферы сваіх цудоўных твораў. Ян жа да смерці заставаўся верны роднай паэзіі...»



Навагрудак. Руіны замка (пач. ХХ стагоддзя).

Па міцкевічаўскіх мясцінах і праўдзе нас Мікола Гайба. Зразумела, самая грунтоўная частка экскурсіі — у самім доме-музеі, які першапачаткова быў адкрыты ў 1938 годзе. У гады Другой сусветнай вайны музей быў моцна пашкоджаны. І аднавілі гэты асяродак асветніцтва, культуры ўжо ў 1955 годзе. З 1989 да 1991 года правялі чарговую рэканструкцыю. А сучасны выгляд музей набыў у 2001 годзе.

— У нашай экспазіцыі, фондах музея захоўваецца некалькі тысяч экспанатаў, — расказвае Мікалай Гайба. — Вялікая калекцыя твораў выяўленчага мастацтва. Дарэчы, у нас заўсёды шмат наведвальнікаў... Гэта і ўражвае, і прымушае шукаць самыя розныя формы арганізацыйнай, даследчай актыўнасці.

Разам з Міколам Гайбам, гуляючы па Навагрудку, згадваем і іншых літаратараў — ураджэнцаў старажытнага паселішча. У 1707 годзе тут нарадзіўся польскі паэт і каталіцкі прапаведнік, доктар тэалогіі Юзаф Бака. Пасля служыў у родным мястэчку місіянерам. Выдаў некалькі кніг духоўнай прозы на лацінскай і польскай мовах. Юзаф Бака — таксама аўтар двух зборнікаў вершаў. Пры яго жыцці да паэта ставіліся досыць крытычна, творы яго называлі «безгустоўшчынай». Быў і такі выраз: «вершы а ля Бака». А ў канцы ХІХ — пачатку ХХ стагоддзя вырасла цікавасць да творчасці Юзафа Бакі. Сёння яго лічаць выдатным паэтам позняга барока. Дарэчы, ва Уладзіслава Сыракомлі ёсць праграмны верш — «Наследаванне Баку».



Навагрудак. Дом Адама Міцкевіча, 1930-я гады.



Навагрудак. Рыначны пляц (пач. ХХ стагоддзя).

З горадам Міцкевіча звязаны і лёс беларускага паэта Алеся Бажко (1917 — 2013), які ў 1936 — 1938 гадах вучыўся ў музычным інстытуце імя Станіслава Манюшкі ў Навагрудку. Пасля яго заканчэння малады чалавек паступіў у Варшаўскую кансерваторыю. Вучоба спынілася з пачаткам Другой сусветнай вайны. Алесь Бажко вярнуўся на Карэліччыну і некаторы час працаваў дырэктарам Мірскага раённага Дома культуры.

Яркая фігура сярод навагрудскіх літаратараў — пісьменнік-мемуарыст Ігнацій Яцкоўскі (1800 — 1873). Працаваў адвакатам. У час падзей 1830—1831 гадоў дзейнічаў разам з навагрудскімі паўстанцамі. Ваяваў у складзе 13-га уланскага палка атрада Г. Дэмбінскага. Пасля паражэння паўстання хаваўся ў Кракаве. У 1833 годзе з Трыеста выехаў у Паўночную Амерыку. Праз некаторы час пераехаў у Лондан. Кіраваў польскай друкарняй і кнігарняй у прыгарадзе Лондана — Тотэнеме. У 1857 годзе атрымаў дазвол вярнуцца на радзіму. Жыў пад Навагрудкам. Пісаў і друкаваў публіцыстычныя артыкулы, нарысы ўспамінаў, вершы. Аўтар публіцыстычных кніг «Палітычныя творы» (Лондан, 1853), «Трохгадовае знаходжанне на Усходзе» (Лондан, 1857). У мемуарах «Аповесць з майго часу, або Літоўскія прыгоды» (першае выданне выйшла ў Лондане ананімна ў 1854 годзе), дзе змясціў верш «Зайграй, зайграй, хлопча малы...» разам са звесткамі пра яго аўтара — Паўлюка Багрыма.

У 1867 годзе ў Навагрудку нарадзіўся рускі філосаф, юрыст, журналіст, публіцыст, літаратурны крытык Сямён Лур'е. Працаваў у часопісе «Русская мысль», газеце «Русские ведомости». Друкаваўся ў часопісах «Исторический обозрение», «Восход», «Мир искусства», іншых выданнях. У 1919 годзе эмігрыраваў у Францыю.

— Здаецца, якое дзесяцігоддзе ні вазьмі — паўсюль па часе раскіданыя літаратурна-краязнаўчыя памяткі, — гаворыць наш гід Мікола Гайба. — Мяркуйце самі... Мемуарыст Фёдар Еўлашоўскі ў шаснаццатым стагоддзі служыў падсудкам навагрудскага земскага суда. Па дарозе ў Гродна ў адной з блізкіх да мястэчка вёсак спынілася з-за хваробы славутая пісьменніца, драматург Францішка Уршуля Радзівіл. Яе прывезлі ў бальніцу ў Навагрудак, дзе яна і памерла. У Навагрудку служыў ваяводам князь Юзаф Аляксандр Яблонскі. Пятнаццаць гадоў служыў — з 1755 да 1772 года. Гісторык, бібліёграф, перакладчык, паэт. Літаратарам быў і іншы навагрудскі ваявода — Мікалай Крыштаф Халецкі. Ён служыў раней за Яблонскага — у 1650 — 1653 гг. На цэлае стагоддзе раней. Яго першы літаратурны твор — панегірык гетману Яну Замойскаму — быў надрукаваны ў Францыі ў 1606 годзе. Халецкі — аўтар многіх навуковых трактатаў, гістарычных даследаванняў... У Навагрудку скончыў гарадское вучылішча яшчэ задоўга да Першай сусветнай вайны паэт, сатырык, гумарыст Анатоль Дзяркач. Імёнаў можна згадаць безліч.

...А колькі пісьменнікаў сюды прыязджала ў канцы ХХ — пачатку ХХІ стагоддзя?! Рускія, беларускія, польскія... Імёны шмат каго з іх можна ўзнавіць, зазірнуўшы ў кнігу наведвальнікаў Дома-музея Адама Міцкевіча. А будзеце мець крыху больш часу — зазірніце яшчэ і ў Навагрудскі краязнаўчы музей. І там не абышлося без памятак літаратурна-краязнаўчых...

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*Паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава.*



Навагрудак. Курган Міцкевіча, 1930-я гады.

Пласты гісторы

# ПАЦЕРКІ СА ШКАРЛУПІНЫ

## У Афрыцы знойдзена найстаражытнейшая сацыяльная сетка

**Яна засноўвалася на абмене і гандлі кара́лямі са шкарлупіны страусавых яек. Навукоўцы выявілі яе ў Афрыцы — тагачасны «УКантакце» квітнеў ужо 50 тысяч гадоў таму. Аб гэтым піша The Guardian. У адрозненне ад электронных сучаснікаў, такая сетка сацыяльных сувязяў засноўвалася на абмене і гандлі вырабамі са шкарлупіны страусавых яек — адной з найбольш старажытных формаў чалавечых упрыгажэнняў.**



Навукоўцы з Германіі вывучылі больш за 1,5 тысячы такіх пацерак, знойдзеных у 31 месцы на поўдні і ўсходзе Афрыкі на адлегласці амаль тры тысячы кіламетраў. Аналіз паказвае, што кара́лямі, якія і ў наш час працягваюць насіць паляўнічыя-збіральнікі ў Афрыцы, абменьваліся на вялізных адлегласцях, такім чынам абменьваючыся сімвалічнымі паведамленнямі і ўмацоўваючы саюзы.

«Гэта як ісці па следзе хлебных крошак. Пацеркі — гэта падказкі, якія былі раскіданыя ў часе і прасторы і чакалі, каб іх заўважылі», — расказала вядучы аўтар даследавання Джэніфер Мілер з Інстытута гісторыі чалавецтва імя Макса Планка ў горадзе Ена.

Параўнаўшы вонкавы дыяметр яечнай шкарлупіны, дыяметр адтулін усярэдзіне і таўшчыню сценак, навукоўцы высветлілі, што каля 50 тысяч гадоў назад людзі ва Усходняй і Паўднёвай Афрыцы пачалі рабіць са страусавых шкарлупін амаль аднолькавыя каралі. Пры гэтым групы і супольнасці былі падзелены вялізнымі адлегласцямі, што прадугледжвае існаванне сацыяльнай сеткі, якая злучае людзей у аддаленых рэгіёнах.

«Вынік дзіўны, але заканамернасць зразумелая», — адзначыў іншы аўтар даследавання, Імін Ван, які таксама працуе ў Інстытуце Макса Планка.

Пацеркі са шкарлупіны страусавых яек — адны з найстарэйшых формаў упрыгажэнняў, хоць і не першая ў Homo sapiens. Навукоўцы лічаць, што мужчыны і жанчыны пачалі мазаць сябе чырвонай охрай з эстэтычнай мэтай каля 200 тысяч гадоў таму, а 75 тысяч гадоў таму — насіць каралі.

Індустрыя ўпрыгажэнняў узнікла каля 50 тысяч гадоў таму ў Афрыцы, калі былі выраблены першыя каралі са шкарлупіны страусавых яек — самая ранняя стандартызаваная форма, вядомая археолагам. Яе выкарыстанне складае адну з самых даўніх культурных традыцый чалавецтва, якая ўключае выяўленне ідэнтычнасці і адносін. Як выказалася Джэніфер Мілер, «гэтыя малюсенькія пацеркі здольныя раскрыць вялікія гісторыі аб нашым мінулым».

Тым не менш, першая ў свеце сацыяльная сетка не праіснавала доўга. Каля 33 тысяч гадоў таму характар нашэння караляў рэзка змяніўся: яны зніклі з Паўднёвай Афрыкі, але захаваліся ва Усходняй. Мілер і Ван мяркуюць, што за гэтым стаялі кліматычныя змяненні, якія праз 17 тысяч гадоў спынілі існаванне найстарэйшай сацыяльнай сеткі на планеце.

Тэхналогіі будучыні

# БІНТ СА СКУРЫ АСТРАНАЎТАЎ

## У NASA вынайшлі біяпрынтар для адпраўкі на арбіту

**Навукоўцы з NASA тэсціруюць новы біяпрынтар, які друкуе медыцынскі пластыр з клеткамі скуры астранаўтаў, што знаходзяцца на МКС. Аб гэтым сказана на сайце касмічнага агенцтва.**




Прылада завецца Bioprint FirstAid. Яна нагадвае пісталет і працуе з дапамогай бiячарніл, якія змешваюцца з жывымі клеткамі чалавека. У NASA кажуць, што на выхадзе атрымліваецца дастаткова трывалы матэрыял, які нагадвае гіпс, — надрукаваная «тканіна» застывае вельмі хутка, так што ёю адразу можна пакрыць як парэзы, так і апёкі.

Звычайныя бінты не заўсёды могуць быць у космасе. Напрыклад, у выпадку парушэння паставак грузаў на МКС ёсць рызыка, што медыцынскія рэчы скончацца, а любая рана для астранаўтаў вельмі небяспечная з-за моцнага крывацёку ва ўмовах бязважкасці, ды і звычайныя бінты ў такіх умовах малаэфектыўныя, кажуць аўтары праекта.

Касманаўтам ужо адправілі першую партыю біяпрынтараў. Пакуль яны ладзяць тэсты і высвятляюць, наколькі такія бінты эфектыўныя ў космасе.

Здароўе на талерцы

# СМАК ДАЎГАЛЕЦЦЯ

## Названы прадукт, здольны падоўжыць жыццё

**Навукоўцы з Гарвардскага ўніверсітэта мяркуюць, што ўжыванне цёмнага шакаладу дапаможа перааддолець генетычную схільнасць да ранняй смерці. Пра гэта паведаміла газета Express.**



Паводле яе, даследаванне паказала: людзі, якія ўжывалі дадзены прадукт, жылі на год даўжэй за тых, хто яго не еў. З-за высокага ўтрымання антыаксідантаў і мінералаў цёмны шакалад паляпшае крывяны ціск і здольны прадухіліць развіццё анкалогіі і сардэчна-сасудзістых захворванняў. Акрамя таго, ласунак паляпшае памяць і работу мозга, а таксама здольны паменшыць рэзістэнтнасць да інсуліну.

Як заўважылі навукоўцы, чым вышэйшая канцэнтрацыя какавы ў цёмным шакаладзе, тым больш актыўных злучэнняў ён утрымлівае. Даследчыкі таксама ўказалі: у тых, хто з'ядаў па тры плиткі такога шакаладу на месяц, рызыка заўчаснай смерці была на 36 працэнтаў ніжэйшая.

Біялогія з анатоміяй

# КАЗЮРКА — БУРЫЛЬШЧЫК ПАРОД

## Прэснаводныя насякомыя: першыя ў свеце разбуральнікі скал

**Новы для навукі від аўсянікаў аказаўся адзінай устаноўленай на дадзены момант прэснаводнай казюркай, якая выклікае біяэрозію сілікатных горных парод. Прадстаўнік старажытнага атрада крылатых насякомых быў адкрыты вучонымі Федэральнага даследчага цэнтра комплекснага вывучэння Арктыкі імя акадэміка Лаверава і Паўночнага (Арктычнага) федэральнага ўніверсітэта (Архангельск) у ходзе работ па ацэнцы прэснаводных біярэсурсаў М'янмы па запыце ўрадавых органаў гэтай краіны. Вынікі даследавання апублікавалі «Известия».**



Казюркі жывуць у басейне ракі Баго (цэнтральная частка М'янмы) у месцы, дзе рака прарывaецца скрозь скальныя грады, складзеныя алеўралітамі (адмысловая разнавіднасць горнай пароды). У цясніне з бурнай плынню і парогамі навукоўцы выявілі скальныя пароды, паверхня якіх была скрозь у адтулінах. Аддзяліўшы кавалак алеўралітавай пліты, яны выявілі ўнутры хады лічынак аўсянікаў.

«Гэта першае ў свеце прэснаводнае насякомае, здольнае разбураць скалы, і першая ў свеце жывёліна, якая выклікае эрозію цвёрдых горных парод, але не мае марскіх сваякоў, а першапачаткова сфарміравалася ў прэснаводным асяроддзі», — адзначыў кіраўнік навуковай групы, дырэктар Федэральнага даследчага цэнтра комплекснага вывучэння Арктыкі імя акадэміка Лаверава, член-карэспандэнт РАН Іван Болатаў.

Падкрэсліваецца, што раней навука звязвала працэсы біяэрозіі выключна з морамі і акіянамі. Лічылася, што макрабіяэрозія ў прэснай вадзе адсутнічае як такая. Аднак у 2018 годзе навукоўцы выявілі ў рацэ Каладан на паўночным захадзе М'янмы першы прэснаводны арганізм, які выклікае эрозію сілікатных парод. Біёлагі выказалі здагадку, што малюск-бурыльшчык Lignopholas fluminalis першапачаткова быў марскім відам, але па меры тэктанічнага ўздыму і пры замяшчэнні марской вады прэснай адаптаваўся да новага асяроддзя пасялення.

У 2019 годзе група амерыканскіх навукоўцаў апісала ўнікальных малюскаў (карабельных чарвякоў), якія разбураюць горныя пароды ў невялікай рацэ на Філіпінах. Па словах Болатава, навукоўцы вылучылі гіпотэзу аб тым, што ўсе тры віды прэснаводных бурыльшчыкаў — малюск-свідравальнік з Каладана, карабельны чарвяк з Філіпін і аўсянік-каменяед з Баго — адбыліся ў групах бесхрыбетных жывёлін, адаптаваных да свідравання драўніны.

Гэта азначае, што эвалюцыйны пераход ад свідравання драўніны да свідравання камянёў прасцейшы, чым пераход ад вольнага ладу жыцця да свідравання камянёў. Гэтаму спрыяюць пэўныя марфалагічныя асаблівасці.

«У прыватнасці, у аўсянікаў ёсць масіўныя сківіцы, якія працуюць як перфаратар. Карабельныя чарвякі надзелены ракавінай у выглядзе свердзела, а малюскі-бурыльшчыкі — конусападобнай ракавінай, круцячы якую, яны прабіваюць хады ў горных пародах. Мы мяркуем, што ў сувязі з недахопам затопленай драўніны ў месцах пасялення драўняныя бурыльшчыкі перайшлі да пошуку сховішчаў і прабівання хадоў у новым субстраце — у скалах», — сказаў Болатаў.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Фота з адкрытых крыніц.





# Купалава Лагойшчына

Два дзясяткі назваў населеных пунктаў толькі ў адным Лагойскім раёне звязаны з імем нашага песняра Янкі Купалы. Сёлета народнаму паэту споўніцца сто сорак гадоў. Давайце згадаем некаторыя з гэтых адметных вёсак, засценкаў і хутароў, бо ў лёсе будучага класіка яны адыгралі найважнейшую ролю: Аўгустова і Косіна, Бяларучы і Прудзішча, Малыя Гаяны і Тукалаўка, Малыя Бясяды і Селішча, Дашкі і Корань, Карпілаўка... У некаторых з іх сям'я Луцэвічаў жыла і арандавала зямлю, у іншых маленькі Яська спасцігаў навуку, вучыўся граматыцы, будучы юнаком, наведваў сваіх сяброў, хадзіў на работу. Некаторыя фальваркі і хутары, у якіх жылі прататыпы яго твораў ужо, на жаль, не існуюць, але, тым не менш, яны засталіся ў назвах лясных урочышчаў, ператварыліся ў вясковыя ўскраіны і вуліцы: такія як колішнія Калдукоўка, Верацейкі, Казімірава, Парабкі, Прытыкі і Здарэнне, Гадлеўшчына, Шкоды, Рубеж і Рубяжок, Айчызна, Міхалішкі і Ляўшова. Нават засценак Селішча, куды пераселіліся арандатары Луцэвічы пасля Прудзішча і дзе ў 1902 годзе заўчасна памёр бацька будучага паэта, у сярэдзіне мінулага стагоддзя абязлюдзеў і знік. Нагадваюць пра яго куча камянёў ад падмуркаў былых сядзіб і некалькі маладых дзікіх дрэў.

Цэнтрам Купалавай зямлі на Лагойшчыне, несумненна, з'яўляюцца Харужанцы і Акопы. У Харужанцах дзейнічае філіял музея Янкі Купалы, за два кіламетры ў ціхім лясным кутку прытаілася акопская мясцінка. Лічу, кожны з нас павінен хоць бы аднойчы тут, на Купалавым Парнасе, пабываць, каб адчуць энергетыку, якая сілкавала маладога паэта. У Акопах Купала стварыў свае неўміручыя «Паўлінку», «Бандароўну», «Прымакоў» і «Раскіданае гняздо», «Тутэйшых» ды іншыя вядомыя творы.

У зімовы і зусім не рознакаляровы (для фота) час мне ўсё ж захацелася праехацца па Купалавай зямлі і зазірнуць у некаторыя з гэтых мясцін.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**







*Больш фота глядзіце на сайце zviazda.by*

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY.

Продавец: **ОАО «СДСК»** (УНП 400024628) 247439, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 10, в лице антикризисного управляющего ООО «Правовая стратегия», тел. + 375 (17) 396-61-34.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **17 марта 2022 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

Прием заявок и задатков с 03.03.2022 г. с 09.00 по 16.03.2022 г. 17.00. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 14.01.2022 г.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов с НДС, руб. |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 342/С-72984, общ. пл. 207,0 кв. м, здание склада, на зем. участке с кадастровым № 325050100002005436, общ. пл. 0,0471 га, г. Светлогорск, ул. Заводская, 6А | 13 944,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 342/С-72804, общ. пл. 413,0 кв. м, здание склада № 2, на зем. участке с кадастровым № 325050100002005434, общ. пл. 0,0976 га, г. Светлогорск, ул. Заводская, 6Б | 27804,00 |
| 3 | Грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 533702 280 СМБ-249. 2006 г/в. Рег. знак АК8701-3, № рамы Y3ВСМБ24961000437 / Y3М53370260007796, цвет белый | 10164,00 |
| 4 | Гидроманипулятор «Джонсэред» с комплектом для установки | 6468,00 |
| 5 | «Ленточнопильный станок МВ-2000м», производства ОДО «Технолессервис» г. Дзержинск РБ, инв. бух. № 0007571 | 3864,00 |

Местонахождение – г. Светлогорск, ул. Заводская, 10.
Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **04 апреля 2022 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28. Прием заявок и задатков с 03.03.2022 г. с 09.00 по 01.04.2022 г. 17.00.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов с НДС, руб. |
|---|---|---|
| 1 | 2/5 доли (1593,5 кв. м) в имущественном праве на объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 342/С-12380, общей площадью 3966,8 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Свердлова, 9 на земельном участке с кадастровым № 325050100001004451 | 439 200,00 |

**Для участия в торгах необходимо** в указанный срок:

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

